Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

8-мы ГОД ВЫДАНЬНЯ.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вараючаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 70 к. 3 м. — 2 р. — к. 6 м. — 4 р. — к. 1 год — 7 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя—20 к. мясцовыя—10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок напарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок напарэлі пасярод тэксту 1 р. — к. За радок напарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпешныя на 50 проц. даражэй. Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: за 1 дакумант 35 кап. За кожны дадатковы .15. Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант .15. За кожны дадатковы .5. Публікацыі ЗАГС'—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.

АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

КОШТ НУМАРУ 4 кап.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 151 (2043) Чацьвер, 7-га ліпеня 1927 г.

Беражы савецкую капейку.

Тав. Ленін у апошніх сваіх артыкулах вызначыў, што разьвіцьцё нашай буйнай машыннай прамысловасьці можа пасьпяхова разьвівацца толькі пры ўмовах «найвялікшай эканоміі гаспадаркі ў нашай дзяржаве». Год назад Цэнтральны Камітэт партыі і ЦКК УсеКП(б) зьвярнуліся да ўсіх партыйных, гаспадарчых, савецкіх і каапэрацыйных арганізацый з прапановаю ўстанавіць найстражэйшы рэжым эканоміі.

Якія-ж вынікі за год?

Па даных асобных гаспадарчых і савецкіх органаў, а таксама па даных Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі, відаць, што за мінулы год дзяржаве ўдалося зьберагчы дзесяткі мільёнаў рублёў.

Шляхам абсьледваньня і суровага націску на гаспадарнікаў і адміністратараў, РСІ дамаглася значнага зьмяншэньня расходваньня дзяржаўных сродкаў на рэкляму, непатрэбныя камандыроўкі, лішнія штаты, лішнія прадстаўніцтвы і іншыя непатрэбныя выдаткі.

Значную дапамогу ў гэтай працы зрабілі партыйныя ячэйкі.

У сучасны момант, калі на чарзе стаяць іншыя палітычныя кампаніі, як барацьба за нізкія цэны, рацыяналізацыя, некаторыя таварышы схільны думаць, што кампанія рэжыму эканоміі скончана. Гэта ня так. З такой адносінай да кампаніі рэжыму эканоміі трэба рашуча змагацца. Гэта кампанія разьлічана на доўгі пэрыяд, і мы ня маем ніякіх падстаў лічыць яе ўжо скончанай.

Рацыяналізацыя вытворчасьці, якая зараз праводзіцца на нашых прадпрыемствах, ня можа поўнасьцю ахапіць працы па барацьбе за рэжым эканоміі. Рацыяналізацыя ў некаторай ступені ахапляе і кампанію барацьбы за рэжым эканоміі ў гаспадарчых органах, і асабліва на прадпрыемствах. Але барацьба за эканомію, нават не залежачы поўнасьцю ад рацыяналізацыі, захоўвае сваё значэньне ў савецкіх установах. Далейшае палепшаньне апарату і яго патаненьне павінна будзе весьціся, галоўным чынам, пад лёзунгам рэжыму эканоміі.

Нельга таксама зьмешваць барацьбу за рэжым эканоміі з кампаніяй па барацьбе з бюракратызмам.

Барацьба з бюракратызмам гэта перш усяго барацьба з валакітаю, з бяздушнымі казённа-фармальнымі адносінамі людзей да справы, з камчванствам і інш. Барацьба-ж за рэжым эканоміі—барацьба з непатрэбнымі, лішнімі выдаткамі.

Мы як і раней павінны згрупаваць увагу ўсёй партыі і ўсёй рабочай клясы на неабходнасьці далейшага максымальнага скарачэньня выдаткаў.

АБ АДЧЫНЕНЬНІ III ПЛЕНУМУ ЦКК КП(б)Б.

4 гэтага ліпеня ўвечары адчыніўся III Пленум ЦКК КП(б)Б скліканьня X Зьезду КП(б)Б з наступным парадкам дню:

1) Справаздача аб рабоце Прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б.

2) Вынікі і пэрспэктывы далейшага спрашчэньня дзяржаўнага і гаспадарчага апарату.

3) Справаздача аб рабоце Віцебскай АКК.

З дакладам аб рабоце Прэзыдыуму ЦКК выступіў т. Калнін, які асьвятліў тую грамадную работу, якая праведзена Прэзыдыумам ЦКК за 6 мес. справаздачнага пэрыяду (Стэнаграма дакладу т. Калніна будзе зьмешчана ў адным з наступных нумароў «Сав. Беларусі»).

У спрэчках па дакладу выказалася 17 чалавек. Выступаючыя ў спрэчках адзначылі грамадную работу, праведзеную Прэзыдыумам ЦКК і асноўную лінію за справаздачны пэрыяд.

Выявілі тыя недахопы, якія маюцца ў працы Кантрольнай Камісіі і шляхі да зьнішчэньня хворых зьявішч.

Вечарам 5-га ліпеня быў заслуханы даклад т. Ракава аб выніках і пэрспэктывах спрашчэньня дзяржаўнага і гаспадарчага апарату. Дакладчык у сваім дакладзе падкрэсьліў тую грамадную работу, якая была праведзена апаратам НК РСІ ў галіне палепшэньня і спрашчэньня дзяржаўнага і гаспадарчага апарату і набліжэньня яго да працоўных мас.

У спрэчках выказалася 13 чалавек.

Выступаючыя ў спрэчках адзначылі наогул правільную і вялікую работу ў галіне спрашчэньня апарату і той эфэкт, які выказаўся ў выніку праведзенай працы. Было падкрэсьлена, што з боку некаторых устаноў адзначаюцца моманты супраціўленьня ў правядзеньні тых рэформ, якія намечаны Калегіяй НКРСІ, што НКРСІ зможа правесьці ўсю працу пры актыўным удзеле самых дзяржаўных і гаспадарчых органаў, і толькі такім шляхам магчыма будзе палепшыць дзяржаўны і гаспадарчы апарат, спрасьціць яго працу, наблізіць да працоўных мас і праводзіць барацьбу з бюракратызмам.

„Саюз „прагарэўшых“ проці СССР“.

БЭРЛІН, 5-VII. Сэкратарыят рады Лігі Нацый агаласіў ліст фінляндзкага ўраду ад 15-га чэрвеня ў раду Лігі Нацый.

Фінляндзкі ўрад адзначае цяжкасьці, па якія натыкаецца ўтварэньне ўгавору аб ненападзе з дзяржавамі, што не ўваходзяць у Лігу Нацый і адхіляюць у прынцыпе ўсякае ўмешваньне Лігі Нацый. Фінляндзкі ўрад прапануе, каб усе сябры Лігі Нацый, якія знаходзяцца ў такім становішчы, як і Фінляндыя і зьбіраюцца ўзяць на сябе абавязацельствы аб устрыманьні ад усякага нападу, утварылі між сабою спэцыяльную згоду. Гэта згода па думцы Фінляндыі, растлумачыла Лізе Нацый задачу вызначыць, хто зьяўляецца нападаючай дзяржавай, што ў выпадку вайны павінна быць, як вядома, галоўнаю асноваю для якіх небудзь мерапрыемстваў з боку Лігі.

Хоць у лісьце фінляндзкага ўраду і не ўпамінаецца СССР, аднак у палітычных колах лічаць, што Фінляндзкі ліст мае на ўвазе СССР.

Жэнеўскі карэспандэнт «Фосішэ Цэйтунг» піша:

«Усё стварае такое ўражаньне, нібыта **проці СССР абходным шляхам мяркуецца скласьці саюз дзяржаў, якія пацярпелі крах ча сваім шляху**»

Сьвяткаваньне юбілею Клары Цэткін.

МАСКВА, 5-VII. 5-га ліпеня ў Калённай залі Дому Саюзаў адбылося сьвяткаваньне 70-цігадовага юбілею Клары Цэткін.

Вэтэрана рэвалюцыі віталі прадстаўнікі Камуністычнага Інтэрнацыяналу, кампартыі Нямеччыны, Маскоўскага Камітэту УсеКП(б), ЦК УсеКП(б), арганізацыі моладзі і піянэраў, чырвонай арміі, а таксама прадстаўнікі рабочых фабрык, заводаў, жанаддзелаў і г. д. Работніцы, сялянкі, служачыя і хатнія гаспадыні Масквы і губ. ухвалілі адзначыць 70-цігадовы юбілей Клары Цэткін заснаваньнем спэцыяльнага фонду «Клара Цэткін». Выканкаму МОПР'у ушануе юбілей арганізацыяй міжнароднага тыдню МОПР'у.

З прычыны хваробы Клары Цэткін не магла прысутнічаць на ўрачыстым пасяджэньні. Яна прыслала ліст рабочым і работніцам Масквы, які быў зачытаны т. Арцюхінай. Клара Цэткін піша, што жаданьне адзначыць яе юбілей вялікім сходам яна ацэньвае як доказ унутранай арганічнай сувязі між ёю і пралетарыятам Савецкага Саюзу. Гэту сувязь Клара Цэткін адносіць не да сябе, а да той вялікай ідэі, служыць якой яна лічыць шчасьцем усяго свайго жыцьця.

БЭРЛІН. 4-7. 70-цігодзьдзе Клары Цэткін выклікала водгук у шырокіх рабочых масах і адзначана шматлікімі артыкуламі ў камуністычным друку, а таксама ў спэцыяльных брашурах, прысьвечаных яе дзейнасьці. Юбілей быў адсьвяткаваны ва ўсіх буйных гарадох. 5-га ліпеня ў Бэрліне адбудзецца дэманстрацыя. МОПР адзначыць 70-цігодзьдзе Клары Цэткін наладжаньнем тыдню дапамогі зьняволеным рэвалюцыянэрам.

БЭРЛІН, 5-VII. ЦК кампартыі Нямеччыны, праўленьне чырвонага саюзу франтавікоў і акруговая бэрлінская арганізацыя камуністычнай партыі зьвярнуліся да Клары Цэткін з прывітальнаю тэлеграмаю з прычыны 70-тых угодак з дню яе нараджэньня. Сёньнешні нумар «Ротэ Фанэ» у значнай частцы прысьвечан Клары Цэткін. Сацыял-дэмакратычны і буржуазна-дэмакратычны друк таксама прысьвячае артыкулы жыцьцю і дзейнасьці Клары Цэткін.

„АРБЭЙТЭР ЦЭЙТУНГ“ АБ ЮБІЛЕІ КЛАРЫ ЦЭТКІН.

ВЕНА, 5-II. Сацыял-дэмакратычны орган «Арбэйтэр Цейтунг» прысьвечвае артыкул юбілею Клары Цэткін. Адзначаючы яе паступовы інтэрнацыяналізм, газэта піша:

«Якою-б ня была пазіцыя Клары Цэткін у адносінах да ранейшых таварышоў па барацьбе, нішто ня можа і не павінна стрымаць нас ад таго, каб выказаць ёй у 70 гадавіну дню яе нараджэньня поўную ўдзячнасьць за яе працу».

Генэралы рыхтуюць контр-рэвалюцыйнае выступленьне супроць Ухана.

ФЫН-ЮЙ-СЯН ПАТРАБУЕ ЛІКВІДАЦЫІ УХАНСКАГА УРАДУ.

ШАНХАЙ 5-VII. Агэнцтва «Говэн» паведамляе з Ханькоу: Тан-Шэн-чы мяркуе рэарганізаваць уханскі ўрад у адпаведнасьці з напрамкам палітыкі нанкінскага ўраду. Фын-Юй-сян, аднак, рашуча супярэчыць проці гэтага і патрабуе поўнай ліквідацыі уханскага рэжыму.

Англія перакідае войска з Кітаю ў Індыю.

ЛЁНДАН, 6-VII. Агалошана афіцыйнае паведамленьне аб пастанове ўраду адклікаць у бліжэйшы тэрмін пяхотную брыгаду з Шанхаю. Брыгада накіроўваецца ў Індыю.

КРЫВАВЫЯ РАСПРАВЫ ГЕНЭРАЛАЎ.

Пакараньне сьмерцю Чэн-Ен-лена.

ШАНХАЙ, 5-VII. Як паведамляе „Чайна Кур'ер“ (правагаміндананаўскі орган) у Шанхаі пакаран сьмерцю Чэн-Ен-лен (сын сябра ЦК кітайскае кампартыі Чэн-Ду-Сю).

„Мін-го-Шы-Бао“ дае такую характарыстыку пакаранаму; „гэты чалавек перасягнуў свайго бацьку. Сучасныя выдатныя лідэры кітайскай кампартыі створаны ім. Ён карыстаўся вялікім посьпехам. Яго слухаліся дзесяткі тысяч рабочых, уплыў яго ў масах быў надзвычайна вялікі“.

Ангельскія газэты паведамляюць, што Чэн-Ен-лен быў арыштаваны па загаду генэрала Ян-Ху, вядомага сваімі масавымі пакараньнямі сьмерцю ў Нінбо. Адначасна з Чэн-Ен-ленам было арыштавана і некалькі чалавек правінцыяльнага камітэту кампартыі і шанхайскай рады прафсаюзаў.

Прысуд на катаргу трох індусаў.

ШАНХАЙ, 5-VII. Ангельскі суд Шанхаю засудзіў на катаржныя працы тэрмінам на 1 год трох індусаў, прыцягненых да адказнасьці за абвінавачаньне ў спробе выклікаць паўстаньне, «сярод падданых ангельскага караля».

ЗАНЯДУЖАНЬНЕ ТАН-ПІН-СЯНА.

ХАНЬКОУ, 4-VII. Міністр земляробства ўханскага ўраду, камуніст Тан-Пін-сян выпрасіў водпуск для папраўкі здароўя. Апроч зазначэньня на неабходнасьць папраівць здароўе Тан-Пін-сян у сваёй заяве зазначае:

«Апошнія падзеі зрабілі палітычнае становішча нагэтулькі сур'ёзным, што адказнасьць за накіраваньне сялянскага руху па правільным шляху мне не пад сілу».

Водлуг некаторых вестак, заявы Тан-Пін-сяна пагоджаны з Цэнтральным Камітэтам кампартыі.

ЧУТКІ АБ ПАРАЖЭНЬНІ НАНКІНСКАГА ВОЙСКА.

ШАНХАЙ, 5-VII. За апошнія дні ўпарта распаўсюджваюцца чуткі аб паражэньні нанкінскага войска ў раёне Хан-Чуана (на граніцы правінцыі Шандунь і правінцыі Чжансу).

У нанкінскіх вайсковых колах адзначаюць няправільнасьць паведамленьня аб паражэньні і заяўляюць, што няма падстаў непакоіцца за шандуньскі фронт бо ўсе апэрацыі разьвіваюцца нармальна.

Як перадаюць, у раёне Цьзінаньфу-Енжоу згуртавана 12 карпусоў паўночнай арміі. Войска Фынь-Юй-сяна стаіць на мяжы правінцыі Чжылі і Шандунь і, па некаторых вестках, мяжы яшчэ не перайшло. Ен-Чы-Шан усё яшчэ захоўвае нэйтралітэт.

Агэнцтва Рэйтара паведамляе, што Ін-Шы-Лін пасланы Чжан-Цзо-Лінам да Ен-Чы-Шана ня быў прыняты і вярнуўся ў Пекін з нічым.

АБУРЭНЬНЕ ПРОЦІЎ ЧАН-КАЙ-ШЫ.

ШАНХАЙ, 5-VII. Як выяўляецца, «выдумкі» японскіх газэт аб тым, што Чан-Кай-Шы загадаў спыніць байкот японскіх тавараў—ня вымысел. Учора яшчэ абураная гэтым правагаміндананаўская газэта «Чайна-Кур'ер», сёньня зьмяшчае фатаграфію клетак, прызначаных для гандляроў, якія зрываюць байкот, з надпісам: «клеткі зруйнаваны па загаду Чан-Кай-Шы». Наогул, проціяпонскі рух за апошнія дні, калі не зьмяншаецца, дык ва ўсякім разе не павялічваецца.

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ.

АМЭРЫКАНСКІЯ ПРАМЫСЛОЎЦЫ ЦІКАВЯЦЦА СССР.

ЛЕНІНГРАД. Сюды прыехала група амэрыканскіх прамыслоўцаў-камэрсантаў-удзельнікаў сусьветнага зьезду гандлёвых палат у Стакгольме, якія зьбіраюцца зрабіць падарожжа па СССР для азнаямленьня з гаспадарчым жыцьцём Саюзу.

Ажыўленьне ленінградзкага порту.

ЛЕНІНГРАД. Не зважаючы на разрыў з Англіяй, у Ленінградзкім порце за чэрвень адзначаецца вялікае ажыўленьне. 4-га ліпеня прыплыў ангельскі параход «Даго»—першы з часу разрыву.

Новы нафтавы фантан.

ГРОЗНЫ, 5-VII. На новай буравой шчыліне № 3 забіў магутны нафтавы фантан. Фантан дае ў дзень 100.000 пуд. нафты.

Растрэл шпіёна Клепікава.

ЛЕНІНГРАД, 5-VII. Растрэлян, згодна пастановы суду, ангельскі шпіён Клепікаў. Справа яго жонкі будзе гэтымі днямі разглядацца паўторна.

Дасьледваньне лёдавікоў Эльбрусу.

ПЯЦІГОРСК, 3-VII. У сярэдніх лічбах ліпеня з Пяцігорску накіроўваецца на чале з праф. Альдбэгам навуковая экспэдыцыя для дасьледваньня лёдавікоў Эльбрусу. Экспэдыцыя арганізуецца геафізычнай абсэрваторыяй, гідралёгічным інстытутам і каўкаскім горным таварыствам. У канцы ліпеня ў раён Эльбруса накіроўваецца 2-ая навуковая дасьледчая экспэдыцыя на чале з праф. Калікіным для вывучэньня энэргіі сонечных праменяў на вышыні.

Дзеці—чубараўцы.

САМАРКАНД, 3-7. У ваколіцы Самарканду 8 хлопчыкаў узростам 13—15 гадоў напалі на праходзіўшую міма 10-цігадовую дзяўчынку Б. Трсо з напаўшых: Сьміркоў, Кашалёў і Сураджанаў згвалцілі дзяўчынку.

Камісія па справах недарослых адмовілася ўзьдзейнічаць на 3-х злачынцаў пэдагагічнымі мерамі.

Гэтымі днямі справа дзяцей-чубараўцаў будзе разглядацца ў Самаркандскім судзе.

Гураган.

ДНЕПРАПЯТРОЎСК, 4-VII. Учора над горадам прайшла навальніца нячуванай сілы разам з гураганным ветрам. Гураган павыдзіраў з карэньнем дрэвы. Пазьдзіраў на хатах дахі, павыбіваў шыбы. Ад удару маланкі здарыўся пажар у памяшканьні акруговага фінансавага аддзелу. Пажар быў хутка загашан. Памяшканьне амаль не пацярпела.

НА ВОЛХАЎСКАЙ СТАНЦЫІ.

ЛЕНІНГРАД. На Волхаўскай станцыі пушчан на рабочы ток 3-ці савецкі генэратар. У сучасны момант з васьмі машын Волхаўстрою працуе 7. Восьмы генэратар будзе скончаны ў канцы ліпеня. У жніўні Волхаўстрой распачне працаваць з поўнаю магутнасьцю і будзе даваць Ленінграду 66.000 кілёўт электрычнай энэргіі пры штодзённай патрэбе гораду ў 60.000 кілёўат.

Пробнае падарожжа цеплавозаў.

МАСКВА, 6-VII. З Масквы ў Баку пашлі ў пробнае падарожжа 2 цеплавозы, пабудаваныя ў Нямеччыне па савецкаму заказу.

Цеплавозы маюць аднолькавыя дызэлі на розныя сыстэмы перадач.

К „Тыдню Абароны“.

МАСКВА, 6-VII. Цэнтральная камісія па правядзеньні «Тыдню Абароны» арганізоўвае ў першы дзень «Тыдню» 10 ліпеня вялікую дэманстрацыю ячэек ТДА—Авіяхіму.

Фактычнасьць шлюбных адносін устанаўляе суд.

МАСКВА, 6-VII. НК Юстыцыі растлумачвае, што фактычнасьць шлюбных адносін можа ўстанаўляць толькі суд. Адміністрацыйныя пасьведчаньні фактычнасьці шлюбных адносін устанаўляць ня могуць.

Нагляд за паляваньнем.

МАСКВА, Калегія НК Юстыцыі разам з Наркамземам узьняла пытаньне аб неабходнасьці павялічыць нагляд за паляваньнем у забароненых мясцох, у забаронены тэрмін і забароненымі спосабамі і зброяй. У зьвязку з гэтым крымінальны кодэкс дапоўнен артыкуламі, які прадугледжвае за парушэньне гэтага закону такую кару: зьняволеньне ці прымусовыя працы тэрмінам да 6 месяцаў або штраф да 500 рублёў з абавязкова канфіскацыяй здабытага на паляваньні.

Забойцы Турава знойдзены.

МАСКВА. 10-га чэрвеня 1927 году каля разьезду Дуброўкі быў забіт навуковы супрацоўнік акадэміі Тураў, які варочаўся з Масквы на дачу. 14-га чэрвеня АДПУ затрымала рабаўніка, які доўга апэраваў у раёне дачнай мясцовасьці Курскай чыгункі, Кудзінава. Ён спрабаваў абараняцца зброяй і быў паранены ў абедзьве нагі. Устаноўлена, што рабаўнік, які назваў сябе Кудзінавым, судзіўся пад прозьвішчам Іванэнкава-Карасьцёва за рабункі ў Ельцы, Курскай губ. Апроч таго, быў затрыман другі рабаўнік Конін, прыяцель Кудзінава, з якім ён удзельнічаў у рабунках. Затрыманыя сазналіся ў забойстве Турава з мэтаю абрабаваньня.

ЗАКОНАПРАЭКТ АБ ПРАФСАЮЗАХ.

Палата лёрдаў ухваліла законапраэкт.

ЛЁНДАН, 6-VII. Палата лёрдаў ухваліла ўчора ў другім чытаньні законапраэкт аб прафсаюзах большасьцю 150-ці галасоў проці 60.

Абгаварэньне законапраэкту на зьезьдзе чыгуначнікаў.

ЛЁНДАН, 6-VII. Зьезд чыгуначнікаў на адчыненым пасяджэньні ўхваліў рэзалюцыю наконт законапраэкту аб прафсаюзах, у якой патрабуе павялічыць прапаганду і асьветную працу, каб забясьпечыць зварот да ўлады рабочага ўраду. Пасьля адчыненага пасяджэньня адбылося зачыненьне.

Была ўхвалена рэзалюцыя, якою падкрэсьліваецца пункт гледжаньня Томаса і ўпаўнаважваецца выканком прафсаюзаў ужыць неабходныя захады, калі законапраэкт не набудзе праваздольнасьці, каб шляхам зьмены статуту дамагчыся новага закону.

Да гэтай рэзалюцыі была пададзена папраўка, якая зазначае, што прафсаюзы павінны ігнараваць законапраэкт аб прафсаюзах.

У выніку жвавых спрэчак, рэзалюцыя, якая падтрымлівае выступленьне Томаса, ухвалена 70-цю галасамі проці 10.

Пастанова чыгуначнікаў зазначае, што рэфармісцкія лідэры ізноў ахвяроўваюць адзіную магчымасьць, якая была ў рабочых, каб застацца панамі становішча. Саюз чыгуначнікаў стварыў прэцэдэнт і па яго прыкладу пойдуць, як відаць, і іншыя прафсаюзы.

Вакол рэформы палаты лёрдаў.

ЛІБЭРАЛЫ КРЫТЫКУЮЦЬ УРАДАВЫЯ ПРАПАНОВЫ.

ЛЁНДАН. 5-VII. Сёньня ў нацыянальным клюбе лібэралаў у Лёндане адбыўся сход найбольш выдатных дзеячоў лібэральнай партыі. На сходзе востра крытыкаваліся ўрадавыя прапановы па рэарганізацыі палаты лёрдаў. У ліку прамоўцаў, што выступалі на сходзе былі Лёйд-Джордж, лёрд Грэй, сэр Гэрбэртс Самюэль і інш. Для сходу характэрны той факт, што на ім прысутнічалі лёрд Грэй і Лёйд-Джордж, якія яшчэ нядаўна вялі між сабой суровую палеміку па пытаньні аб напрамку палітыкі лібэральнай партыі. Усе прамоўцы падкрэсьлівалі, што праэкт рэформы палаты лёрдаў будзе спадручны лібэралам і з пункту гледжаньня лібэральнае партыі мае вялікую каштоўнасьць у якасьці агітацыйнага матар'ялу для перадвыбарчай кампаніі.

Лёйд-Джордж падкрэсьліў, што з пачатку ўрад высоўваў гэтыя прапановы як цьвёрдыя, якія ўрад мае намер правесьці законадаўчым парадкам у працягу бліжэйшага году. У працягу мінулага тыдню гэтыя прапановы аднак набылі «пробны» характар. На гэтым тыдні яны ўжо „выпадковы“ і ніхто ня ведае, што з імі будзе далей. «Пазаўтра,—скончыў ён,—калі я толькі не памыляюся яны будуць праваленымі.

Габінэт ня прыме папраўак кансэрватараў.

ЛЁНДАН, 5-VII. Ангельскі габінэт абмяркоўваў учора напрамак паводзін на надыходзячых заўтра ў палаце вобшчых спрэчках па пытаньні аб рэформе палаты лёрдаў. «Дэйлі Тэлеграф» паведамляе, што габінэт ня згодзіцца ні на адну з папраўак кансэрватараў да рэзалюцыі рабочай партыі, якая ганьбіць урад, і будзе патрабаваць адхіленьня гэтай рэзалюцыі.

ПРАДСТАЎНІК АНГЕЛЬСКАГА ШТАБУ Ў РЫЗЕ.

РЫГА, 5-VII. У Рыгу прыехаў з Коўны прадстаўнік ангельскага штабу майёр Н'емон. Ён быў прыняты вышэйшымі латвійскімі вайсковымі асобамі, а таксама вайсковым міністрам.

ПОЛЬСКА-ЛІТОЎСКІЯ АДНОСІНЫ.

Орган літоўскай хадэцыі «Ritas» зьмясьціў вывяд свайго жэнеўскага карэспандэнта з польскім міністрам замежных спраў Залескім, які выказаў надзею, што Польшча і Літва дойдуць да навязаньня нармальных адносін, дыплёматычных і гаспадарчых, шляхам беспасрэдных перамоў. Перамовы гэтыя былі-б як-бы працягам пачатых ужо ў Лугано і Капэнгагене перамоў. **Віленская справа не павінна быць пры гэтым парушана.** У бліжэйшы час аб так званай максымальнай праграме, з уключэньнем да яе пытаньня аб Вільні, мовы быць ня можа.

У Заходняй Беларусі.

АРЫШТЫ У МАЛАДЗЕЧНЕ.

ВАРШАВА, 5-VII. У Маладэчне арыштавана 20 чалавек, абвінавачаных у камуністычнай дзейнасьці.

ЦЯГНУЦЬ ДА АДКАЗНАСЬЦІ.

Рэдактар «Сялянскай Нівы» К. Мацкевіч атрымаў акт абвінавачаньня за канфіскаваны № 27, у якім былі зьмешчаны артыкулы «Сьвяткаваньне» і «Аб нашай мінуўшчыне».

Вінаваціцца рэдактар у тым, што быццам гэтымі артыкуламі ён падбураў насяленьне Зах. Беларусі да адарваньня тэрыторыі Зах. Беларусі ад Польшчы і стварэньня незалежнай Беларускай рэспублікі.

Новая газэта.

Вышаў першы нумар газэты «Сялянскі Голас», выдаваемы Радыкальнай Сялянскай Партыяй Беларускіх Земель.

Партыю гэтую складаюць пасяы сойму, бышыя «Вызваленцы», а пасьля «Энпэхоўцы»: Бон. Шапель і Шакун.

Першы—паляк, а два апошнія лічаць сябе беларусамі.

З выбарчае статыстыкі ў Вільні.

Газэты падаюць цікавыя лічбавыя даныя аб ходзе апошніх выбараў у самаўрад г. Вільні.

У паасобных абводах галасаваньня лічба асоб, якія скарысталі са свайго выбарчага права, вагаецца ад 41,2 проц. да 73,1 пр. Найніжэйшы проц. удзельнікаў галасаваньня прыпадае на ваколічныя мясцовасьці. У некаторых цэнтральных абводах процант удзельнікаў дасягаў лічбы 70.

Газэты стаўляюць побач даныя сёлетніх выбараў з данымі выбараў у сойм у 1922 годзе. Тады агульны процант удзельнікаў дасягаў лічбы 69,84. Цяпер—толькі 58 пр. (на агульную лічбу 103,240, якія маюць права голасу, скарыстала з гэтага права 59,904).

З ВЫДАВЕЦКАЙ НІВЫ.

Вышлі з друку беларускія месячнікі „Заранка“—дзіцячая часопісь № 4 і „Саха“ гаспадарчая часопісь № 4.

Выходзіць в друку „Беларуская Літаратурная Хрыстаматыя“, укладзеная д-рам І. Дварчанінам. Кніжка будзе мець каля 500 старонак друку і зьмяшчае выбраныя творы нашых пісьменьнікаў.

У панскай Польшчы.

„ПАЛОМНІЦТВА“ ДА КАВЭРДЫ.

ВАРШАВА, 5-VII. Газэта «АВС» паведамляе, што да Кавэрды, з дазволу ўлады, наведваецца шмат асоб, якія прыяжджаюць як з Польшчы, так і з-за граніцы. Надоечы да яго наведаліся: удава пісьменьніка Арцыбашава, старшыня «рускага саюзу» Сямёнаў і бышыя прэздам у Варшаве вядомы манархісты Полаўцаў, і шмат іншых.

Новы старшыня муніцыпальнай рады Варшавы.

ВАРШАВА. 5-VII. Старшынёю муніцыпальнай рады Варшавы абран эндэк Слонімскі. За яго галасавалі эндэкі і частка пілсудчыкаў. Пэпэсаўцы і бундаўцы галасавалі за свайго кандыдата.

ПОСЬПЕХ ЛЕВЫХ НА ВЫБАРАХ.

ВАРШАВА, 6-VII. З прычыны посьпеху левых рабочых груповак на выбарах у бальнічныя касы, урад адклаў далейшыя перавыбары да 1929 году.

Патэк аб польска-савецкіх дачыненьнях.

ВАРШАВА, 5-VII. Водлуг вестак афіцыёзнай «Эпокі» прыехаўшы ў Варшаву польскі пасланьнік у СССР Патэк лічыць, што ў выніку яго перамоў з савецкім урадам ня толькі зроблен крок на шляху да ліквідацыі абвостранага становішча польска-савецкіх дачыненьняў, але і на шляху да прадоўжаньня перамоў аб утварэньні гарантыйнага ўгавору.

У кулацкай Літве.

Расправа фашыстаў.

Ваенны суд прыгаварыў Х. Розэнталь і Р. Біляса, у якіх знойдзена 100 кілёграмаў камуністычнай літаратуры, на 15 гадоў турмы.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ.

КАШЭН ВЫЗВАЛЕН.

ПАРЫЖ, 4-7. Кашэн і 4 іншыя камуністы, засуджаныя па адной справе зьявіліся сёньня ў астрог, каб адбыць кару. Непаразуменьняў ня было.

ПАРЫЖ, 4-7. Палата па прапанове сацыяліста Барона ўхваліла адкласьці тэрмін зьняволеньня Кашэна, да сканчэньня дазнаньня. Кашэн вызвален.

АХВЯРЫ ТЭРОРУ НОСКЕ.

БЭРЛІН, 1-VII. Пры пракладцы гарадзкой чыгункі ў рабочым раёне Моабіт рабочыя паткнуліся на магілу, у якой было 16 шкілетаў. Магіла знойдзена ў садзе, які ў часе рэвалюцыі быў заняты атрадам спартакаўцаў. Думаюць, што ў магіле знаходзяцца астанкі ахвяр тэрору Носке.

Канфэрэнцыя арганізацыі дапамогі пацярпеўшым ад стыхійных навал.

БЭРЛІН, 5-VII. Учора ў Бэрліне адчынілася міжнародная канфэрэнцыя арганізацыі дапамогі пацярпеўшым ад стыхійных навал. Запросіны на канфэрэнцыю пасланы ня толькі сябром Лігі Нацый але і краём, якія не ўваходзяць у Лігу Нацый—СССР, Амэрыцы, Мэксыцы, Турцыі і інш. СССР на канфэрэнцыі ня ўдзельнічае.

Савецкія матацыклісты ў Бэрліне.

БЭРЛІН, 5-VII. Савецкія матацыклісты прыехалі ўчора ўвечары з Лейпцыгу ў Бэрлін.

Рабочы і стачачны рух.

ЗВАЛЬНЕНЬНЕ БАСТУЮЧЫХ.

БЭРЛІН, 5-VII. Бастуючыя ў Кэльне рабочыя мэталісты адмовіліся выканаць патрабаваньне саюзу прадпрыемцаў спыніць забастоўку. Прадпрыемцы з заўтрашняга дню распачнуць звальняць усіх бастуючых.

Забастоўка ангельскіх гарнякоў.

ЛЁНДАН, 6-VII. У Містэпе (Паўднёвы Уэльс) забаставала 10.000 гарнякоў.

СПРАВА ПОЛЬСКАЙ ПАЗЫКІ.

Ужо многа часу польскія газэты пішуць аб польскай пазыцы ў Амэрыцы. Спачатку была амаль ня поўная надзея на пазыку. Потым сталі пісаць, што справа польскай пазыкі «адкладзена на восень», ці нават—на невядомы час...

Венская прэса, заўсёды добра паінфармаваная, даведалася, быццам амэрыканская пазыка, якая ўжо была зусім прызначана Польшчы, разьбілася ў апошнія дні... Амэрыканскія банкі быццам заявілі, што ня лічаць сучасны момант адпаведным дзеля пазык на эўрапейскім рынку...

Гэта пісалі венскія газэты. Польскія правыя газэты таксама пісалі, што весткі і чуткі аб адкладзе пазыкі зусім падобны да праўды, тым больш, што ўрад аб гэтым афіцыйна нічога ня кажа.

Потым па Варшаве пашлі чуткі, што перагаворы аб пазыцы раптам спыніліся на месяцы; амэрыканскія банкіры зрабіліся ня менш цьвёрдымі, як іх валюта...

Апрача палітычных матываў, банкіры кажуць, што цяпер на амэрыканскіх рынках вельмі нявыгодны час для пазыкі.

Эўропа грошы ня мае, дык усе эўрапейскія пазыкі перакінуты на амэрыканскі рынак. Гэты рынак запоўнены пазыковымі паперамі розных эўрапейскіх драбнейшых дзяржаў, страшэнна ўпаўшымі на курсе. Банкі, якія скупілі гэтыя пазыковыя паперы, ня могуць збыць іх шырокай публіцы. Дык таму даваць якую-небудзь новую пазыку банкам нявыгодна—гэта значыла б— трымаць пазыковыя паперы ў скрынях. А кінуць іх на рынак немагчыма, бо курс на іх страшэнна спадае. Напрыклад, пазыка Югаславіі яшчэ нават не атрыманая ёю, ужо спала на амэрыканскім рынку на 8 проц.

З гэтага ўсяго ясна, што банкіры прапануюць Польшчы прыняць такія варункі пазыкі, якія-б адразу і поўнасьцю забясьпечылі іх ад рызыкі спаду курсу пазыкі. Іначай—яны будуць чакаць лепшых часоў. Дык ясна, паскольку нявыгодныя варункі прапануюць банкіры Польшчы, калі польскі ўрад пры ўсёй небясьпецы, якая пагражае дзяржаве, ня хоча прыняць гэтае пазыкі.

«Выгадны момант для пазыкі, здаецца, прайшоў»,—пішуць з Варшавы ў «Дзеньнік Віл».

Урад, няглядзячы на заявы правае прэсы, усё-ж такі, апублікаваў праз афіцыйнае агэнцтва «ПАТ» апавяшчэньне ў справе загранічнай пазыкі гэткага зьместу:

«З прычыны паяўленьня ў газэтах вестак у справе загранічнай пазыкі, зусім фальшывых і г. д. — міністэрства скарбу заяўляе: «Няпраўда, быццам перагаворы аб пазыцы сарваны. Фальшывая таксама вестка аб тэй групе банкіраў, з якой урад вядзе перагаворы аб пазыцы. Наадварот, група банкаў, якая вядзе перагаворы з урадам, складаецца з першарадных амэрыканскіх фірмаў, да якіх яшчэ далучыўся шэраг найпаважнейшых эўрапейскіх фірмаў...

Што-ж датычыць да сёньняшняга стану перагавораў, дык цяпер ідуць тэхнічныя працы, зьвязаныя з пазыкай, дый робяцца прыгатаваньні да яе рэалізацыі ў **моманце, калі стан нью-іорскага і іншых сусьветных грашовых рынкаў будзе для ўсялякага роду загранічных пазыкаў больш памысны».** (падчыркнута намі К—ч).

У канцы камунікат пагражае судовай адказнасьцю за публікаваньне фальшывых і шкодных для дзяржавы вестак аб пазыцы.

Такім чынам, мы бачым, што сам урадавы камунікат ясна і бясспрэчна сьцьвярджае, што **атрыманьне грошы ў рукі польскага ўраду адложана на час, калі эмісійныя варункі сусьветнага грашовага рынку будуць больш памыснымі.**

Прасьцей кажучы—на неабмяжованы, неазначаны час... А ў гэтым крыецца найбольшая небясьпека для польскай валюты.

К—ч.

ПАДРОБНАСЬЦІ АПОШНЯЙ „АПЭРАЦЫІ“ БЕЛАГВАРДЗЕЙЦАЎ.

(Гутарка с намесьнікам старшыні АДПУ т. Ягада).

МАСКВА, 5-VII. У гутарцы з супрацоўнікамі маскоўскіх газэт, намесьнік старшыні Аб'яднанай Дзяржаўнай Палітычнай Управы т. Ягада паведаміў надзвычайна цікавыя падрабязнасьці апошняй «апэрацыі» белагвардзейцаў на савецкай тэрыторыі, апэрацыі сваячасна спыненай у аснове і каштаваўшай тэрарыстам жыцьця.

У якой меры сур'ёзным трэба лічыць замах на выбух на Малай Лубянцы? Выбух падрыхтоўваўся досыць здольна. Арганізатары выбуху зрабілі ўсё ад іх залежнае, каб надаць выбуху максымальную руйнуючую сілу. Яны ўстанавілі надзвычайна магутны мэлінітавы снарад. На некаторай адлегласьці ад яго былі растаўлены ў вялікім ліку запальваючыя бомбы. Нарэшце, падлога ў доме на Малай Лубянцы была паліта газаю. Калі-б уся гэта сыстэма прышла ў рух, дык амаль, бясспрэчна, што памяшканьне па Малай Лубянцы № 3-6 было-б зруйнавана. Выбух быў адхілен у апошні момант супрацоўнікамі АДПУ.

Як відаць, загатоўка такіх снарадаў патрабавала значнага часу. Снарады і наогул уся тэрарыстычная апаратура загінуўшых белагвардзейцаў была загатоўлена ня ў СССР, а прывезена з-за граніцы. Гэта намі ўстаноўлена зусім дакладна. І канструкцыя снарадаў і матар'ялы для выбуху выразна чужаземнага паходжаньня. Між іншым навуковая экспэртыза вядомых спэцыялістаў хімікаў устанавіла з поўнай катэгарычнасьцю ангельскае паходжаньне мэлініту.

На зразумелых прычынах я ня буду зазначаць на ўсе сьцежкі, якія прывялі ад Лубянскага пляцу ў Маскве да беларускіх лясоў, дзе мы дагналі хаваўшыхся злачынцаў. Магу толькі зазначыць, што некаторыя рэчы, знойдзеныя ў доме, дзе падрыхтоўваўся выбух, а таксама весткі, атрыманыя намі з Фінляндыі, выявілі нам асобу арганізатараў чарговага белагвардзейскага замаху. Гэта былі нашы «старыя знаёмыя»: вядомая тэрарыстка Захарчэнка-Шульц, якая ў працягу некалькіх гадоў змагалася ўсімі спосабамі з савецкай уладай, зьяўляючыся нябогаю белага генэрала Куцепава, вядомага нават заграніцаю па сваёй выключнай нечалавечай суровасьці ў адносінах да падначаленых яму белых салдат і казакаў, і заслужыўшага ў эміграцыі прозьвішча «Куцеп-пашы». Яна разам з сваім дзядзькам і шэфам зьяўлялася давераною асобаю і сталым агентам ангельскае разьведкі. У асобе Куцепава і Шульц зарубежныя манархісты мелі сваіх бадай што самых большых актывістаў.

Другі ўдзельнік замаху Опэрпут таксама ня новая асоба на белагвардзейска-шпіёнскім кругавідзе. Опэрпут ня раз перакачоўваў з адной процісавецкай групоўкі ў другую і быў арганізатарам савінкаўскіх вайсковых груп на Беларусі, а таксама давераною асобаю ў права-манархіста-мікалаеўцаў. Пражываючы апошнія месяцы ў Фінляндыі, ён зьмяшчаў свае заметкі ў гэльсінгфорскіх газэтах «Со», «Суамі», «Хуву-стадблят» і інш., якія праводзілі найбольш суровую агітацыю проці СССР.

Трэці ўдзельнік замаху на Лубянцы, які называўся па падложным пашпарце Вазьнясенскі, зьяўляўся «вылучэнцам» з ліку белых афіцэраў, пасланы генэралам Куцепавым у Фінляндыю для ўдзелу ў тэрарыстычнай працы.

Перад самым выездам тройкі ў Расею генэрал Куцепаў прыехаў «праінспэктаваць» ле з Парыжу ў Фінляндыю. Тут, у Гэльсінгфорсе адбыліся апошнія нарады усёй групы, у якой узяў вялікі ўдзел спэцыяльна прыехаўшы з Рэвелю капітан Рос—супрацоўнік брытанскай місіі ў Рэвелі—які спэцыяльна загадвае разьведкаю на СССР

Як відаць, апэрацыі на Лубянцы надавалася вялікае значэньне, яна была буйнаю стаўкаю. І гэта стаўка была бітаю. Пасьля правалу замаху тэрарысты зараз-жа рушыліся з Масквы да заходняй мяжы ў раён Смаленскай губ. Выклікана гэта тым, што ў групы не заставалася ніякай базы, ніякага прытулку ў Маскве. У Смаленскім жа раёне Опэрпут спадзяваўся выкарыстаць старыя сувязі, знаёмства сярод ранейшых савінкаўцаў. Апроч таго, тут яму і Шульц была добра знаёма мясцовасьць

Але намеры шпіёнаў-тэрарыстаў не ажыцьцёвіліся. Сялянскае жыхарства прыгранічных раёнаў, шырока апавешчанае мясцовымі органамі АДПУ аб уцекачох, паказала добры прыклад разуменьня задач працоўных і сапраўдных адносін сялянства да ворагаў савецкае ўлады. Трэба мець на ўвазе, што як раз Смаленская і Віцебская губ. у свой час кішэлі бандыцкімі шайкамі, з якіх складаліся кадры савінкаўскіх банд. Зараз якраз у гэтых мясцох сяляне актыўна дапамагалі нашым органам выкрыць тэрарыстаў.

Белагвардзейцы ішлі ў двох розных напрамках. У вёсках яны выдавалі сябе за сяброў нейкіх камісій і нават за агентаў крымінальнага вышуку. Опэрпут, які ўцёк асобна, ледзь ня быў затрыманы ужо 18-га чэрвеня на Яноўскім сьпірта-гарэлачным заводзе, дзе ён паказаўся падазроным. Уцякаючы, ён адстрэльваўся і параніў міліцыянэра Лукіна, рабочага Краўцова і селяніна Якушэнку. Опэрпут уцёк. Кіраваўшы пагоняю намесьнік начальніка Асобнага Аддзелу Беларускага Вокругу склікаў сабе на дапамогу сялян. Уважлівае і мэтадычнае ачапленьне дало магчымасьць выкрыць Опэрпута. Ён адстрэльваўся з двух маўзэраў і быў забіты пры перастрэлцы.

Іншыя тэрарысты, прабіраючыся на Віцебск, у напрамку да мяжы, Захарчэнка-Шульц і «Вазьнясенскі» спаткалі па дарозе аўтамабіль, які ішоў з Віцебску ў Смаленск. Уцекачы спынілі машыну і пагражаючы рэвальверамі загадалі шофэрам ехаць у паказаным імі напрамку. Шофэр т. Грэбнюк адмовіўся весьці машыну і быў зараз-жа застрэлен. Памоцнік шофэра Галенкоў, паранены белагвардзейцамі, сапсаваў машыну. Тады Захарчэнка-Шульц і яе падарожнік кінулі аўтамабіль і зноў схаваліся ў лесе. Уцекачы былі выкрыты ізноў у раёне станцыі Дрэтунь. Зноў-такі пры актыўным удзеле сялян ўдалося арганізаваць аблаву. Спрабуючы прабрацца праз ачапленьне, шпіёны-тэрарысты вышлі лесам на хлебапекарню Н-га палка. Тут іх убачыла жонка чырвонага камандзіра таго-ж палка Раўнова. Пазнаўшы ў іх, па прыметах, шпіёнаў, яна стала склікаць чырвонаармейскую заставу. Захарчэнка-Шульц стрэлам параніла Раўнову ў нагу.

Наскок ангельскіх агентаў быў скончан. У перастрэлцы з нашымі кавалерыстамі абодвы белагвардзейцы разьвіталіся з жыцьцём. «Вазьнясенскі» быў забіты на месцы. Шульц памерла ад ран праз некалькі гадзін. Знойдзеныя пры забітых рэчы пацьвердзілі ўсё. Пры іх апроч зброі і запасу патронаў былі ангельскія гранаты сыстэмы «Лемана». На фурманцы, якую тэрарысты кінулі ў часе пагоні за Дарагабужам, знойдзены таксама ў вялікім ліку рэчы для выбуху такія самыя, як і на Малай Лубянцы, фальшывыя пашпарты, у якіх мы з першага-ж погляду пазналі прадукцыю фінскае разьведкі, фінскія грошы і нарэшце царскія залатыя манэты, на якія вельмі спадзяваліся ўцекачы. Апроч таго, быў знойдзен дзеньнік і шмат іншых запісаў каштоўных для далейшага расьледваньня

Матар'ялы для дакладчыкаў па кампаніях „Наш адказ Чэмбэрлену“ і „Тыдзень Абароны“.

(Рэкамандуемыя АПА ЦК КП(б)Б).

1. Апошнія пастановы VIII пленуму Выканкому Камінтэрну, яго зварот да ўсіх працоўных сьвету, адозвы нашае партыі «Да ўсіх арганізацый, да ўсіх рабочых і сялян» і «Урадавае паведамленьне» ад 8-га чэрвеня 1927 году вельмі востра паставілі пытаньне аб небясьпецы новае імпэрыялістычнае вайны і падрыхтоўкі [illegible] ваеннага нападу на Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Капіталістычная Англія робіць усё магчымае, каб знайсьці прычыну і распачаць вайну з саветамі. Пад кіраўніцтвам Англіі праведзены: напад на савецкае пасольства ў Пекіне, наскок на гандлёвае прадстаўніцтва СССР у Лёндане. Бяз усякіх падстаў і апраўданьняў ангельскі кансэрватыўны ўрад парваў дыплёматычныя зносіны з Савецкім Саюзам

Англія актыўна працуе над арганізацыяй блёку некалькіх дзяржаў для нападу на нас. Мы зьяўляемся сьведкамі ганебных удараў з-за вугла, якім зьяўляецца забойства т. Войкава, нашага паўнамоцнага прадстаўніка ў Польшчы; мы зьяўляемся сьведкамі новых контр-рэвалюцыйных змоў і тэрарыстычнае працы нашых заклятых ворагаў-белагвардзейцаў. Усё гэта робіцца пад кіраўніцтвам капіталістычнае Англіі. Усё гэта робіцца для таго, каб як мага хутчэй уцягнуць Савецкі Саюз у вайну*).

СТАН УЗБРОЕНЬНЯ КАПІТАЛІСТЫЧНЫХ ДЗЯРЖАЎ.

2. Капіталісты шмат гаварылі і гавораць аб разбраеньні. Але гэта ўсё толькі на словах. Усе прапановы і заявы ў гэтым напрамку зьяўляюцца пашчырасьцю і зьдзекам. На справе капіталістычныя ўрады ўсіх краін прадаўжаюць пасьпешна ўзбройвацца. Яны робяць усё для таго, каб павялічаць вайсковыя бюджэты, узмацняць тэхнічнае ўзброеньне сваіх армій і павялічваць колькасьць апошніх.

Ніжэйпрыведзенае зьяўляецца яскравым доказам усяго гэтага.

ВАЕННЫЯ БЮДЖЭТЫ.

3. У 1913 годзе вайсковыя бюджэты Англіі, Францыі, Італіі, Нямеччыны, Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў, Японіі складалі 2 міліярды 800 млн., а ў 1926 годзе яны дасягнулі сумы ў 4 міліярды 282 млн. руб. Адбылося павялічэньне вайсковых бюджэтаў амаль на 70 проц

Вайсковы бюджэт Англіі ў 1913 годзе раўняўся 430 млн. даляраў, а ў 1926 годзе ён складаў 605 млн. даляраў.

Вайсковы бюджэт Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў са 133 млн. даляраў у 1913 годзе ў 1926 годзе ўзрос да 659,6 млн. даляраў, г. зн. павялічыўся на 500 проц.

Табліца вайсковых выдаткаў суседніх з СССР дзяржаў (у далярах):

Польшча: 1924г.—120400000,1925г.—152.900.000; Фінляндыя: 1923 г.—10.700.000, 1924 г.—10.700.000, 1925 г.—14.900.000; Латвія: 1923 г.—5.500.000, 1924 г.—6.800.000, 1925 г.—9.100.000; Эстонія: 1923 г.—4.100.000, 1925 г.—4.800.000; Румынія: 1924 г.—24.200.000.

РОСТ СУХАЗЕМНЫХ АРМІЙ ІМПЭРЫЯЛІЗМУ.

4. У 1913 годзе Англія, Францыя і Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты мелі ў сухаземнай арміі 1.413.000 чал., у 1923 г. — 1.681.000 і ў 1926 г.—1.821.000 Агульная колькасьць армій нашых суседзяў—Фінляндыі, Эстоніі, Латвіі, Польшчы і Румыніі—была ў 1926 годзе—479 тысяч чалавек, а да 1927 г.—556 тыс.

Лічбы па асобных краінах яшчэ больш наглядныя.

Францыя ў 1913 годзе мела сухаземную армію ў 546.000 чал., а ў 1925 г. ле сухаземная армія складала 685.000 чал.

Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты мелі ў 1913 годзе 220.000 чал., а ў 1925 годзе іх сухаземная армія складала 408.000.

У суседніх з намі краінах мы таксама бачым, з падаваемай ніжэй табліцы, павялічэньне армій штогод.

Польшча мела ў 1923 г.—264.000 чал., у 1924 г.—308.000 чал., 1925 г.,—325.000 ч. Румынія мела ў 1923 г.—153.000 чал., у 1924 г.—147.000 чал., у 1925 г.—158.000 чал. Фінляндыя мела ў 1923 г.—30.000 чал. у 1924 г.—30.000 ч., у 1925 г. 33.000 чал. Эстонія мела ў 1923 г.—12.000 чал., у 1924 г.—12.000 ч., у 1925 г.—14.000 чал. Латвія мела ў 1923 г. 20.000 чал., у 1924 г.,—20.000 чал. і ў 1925 г.—22.000 чал

МАРСКІ І ПАВЕТРАНЫ ФЛЁТЫ.

5. Праграма марскога суднабудаўніцтва Брытанскае імпэрыі прадугледжвае за час з 1922-23 г. да 1932-33 г. павялічэньне «лёгкіх» марскіх сіл: надводных—на 54 проц., падводных—на 45 проц.; Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты прадугледжваюць адпаведнае павялічэньне на 24,5 проц. падводных і на 14 проц. надводных; Японія—на 80 проц. надводных і на 72 падводных; Францыя—на 300 проц. падводных і на 200 проц. надводных; Італія—на 115 пр. надводных і на 12 проц. падводных. Паветраны флёт Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў, Англіі, Францыі, Італіі павялічыўся з 150 адзінак у 1923 г. да 3.550 адзінак у 1926 годзе, г. зн. павялічыўся ў 20 разоў.

3 нямэншай актыўнасьцю вядзецца падрыхтоўка і да хімічнае вайны з боку ўсіх капіталістычных дзяржаў.

Выраб хімічных сродкаў надзвычайна шырока практыкуецца ва ўсіх капіталістычных краінах.

У Францыі выраб «зьвязанага азоту», неабходнага для ўзрыўных матар'ялаў, без якога, як вядома, ні адна армія ня можа ваяваць, дасягае 200.000 тон у год. Выраб хлора дасягае 25.000—30.000 тон у год.

У Англіі фарбарная прамысловасьць была слабая, цяпер яна пакрывае 80 проц. патрэб краіны.

На ваенна-хімічныя дасьледваньні ў Японіі адпушчана на год 5.000.000 зал. рублёў.

Польшча таксама зрабіла вялікія посьпехі ў разьвіцьці хімічнае прамысловасьці. Тадавая вытворчасьць «зьвязанага азота» у Польшчы дасягае 30.000 тон.

ВАЙСКОВА-ГРАМАДЗКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ КАПІТАЛІСТЫЧНЫХ КРАІН І ВАЕНІЗАЦЫЯ НАСЕЛЬНІЦТВА.

6. Але гэта ня ўсё. Буржуазея арганізоўвае свае ўласныя клясавыя вайскова-грамадзкія арганізацыі.

З розных вайскова-грамадзкіх арганізацый буржуазеі неабходна адзначыць:

«Дабраахвотная міліцыя нацыянальнае бясьпечнасьці» (фашысцкая міліцыя) у Італіі налічвае да 300000 чал. Вайскова-грамадзкія арганізацыі ў Фінляндыі—«Шюцкор» з жаночай дапаможнай арганізацыяй пры ім, Стралковы Саюз, Таварыства афіцэраў рэзэрву, Саюз паветранай абароны і Таварыства марскіх афіцэраў, якія складаюць звыш 100000 чал. «Ліга абароны» у Эстоніі (ня менш 25000 чал.), «Латвійская арганізацыя абароны (30000 чал.), «Стралковы Саюз—(250000 чал) у Польшчы і яе аб'яднанае таварыства «Ліга паветранай абароны», маючая мэтай, як гаворыць яе § 1 статутуту, дапамагаць разьвіцьцю польскае авіяцыі ва ўсіх яе правах, усебакова вывучаць сродкі хімічнае абароны. (Трэба чытаць: і «нападаў»).

(Далей будзе).

*) Матар'ялам для разьвіцьця першага пункту зьяўляюцца:
1) „Тэзісы Камінтэрну аб вайне і ваеннай небясьпецы“, абвешчаныя ў газэце «Праўда» ад 2-га чэрвеня г.г.
2) Даклад т. Рыкава на пленуме Масавету 1-га чэрвеня г.г.—газэта «Праўда» ад 2-VI-г.г.
3) Усе звароты ЦК УсеКП(б),ЦК УсеЛКСМ і „Урадавае паведамленьне“

У Савецкай Беларусі.

С.-г. падатак.

(Расьнянскі раён, Аршаншчына).

Нармальная праца па вучоту аб'ектаў абкладаньня с.-г. падаткам на 27-28 год у Расьняншчыне пачалася з 24 мая г. г.

Дасягненьнямі па вучоту трэба лічыць: з пачатку кампаніі па 20 чэрвеня г. г. плянавы вучот праведзен у 59 паселішчах з лікам 2171 гаспадаркі.

У параўнаньні з мінулым годам па гэтых 59 паселішчах павялічылася: ральлі на 285 дзес., пасеву на 235 дзес., сенажаці на 142 дзес., саду на 1 дз., сьвіней на 284, рамачных вульляў—48 шт., калодных—146 і неземляробскіх прыбыткаў на 22400 р.

Паменшылася буйнай абкладаемай жывёлы (кароў) на 683 галавы і коняй на 366.

Адначасова з гэтым падлічана неабкладаемая жывёла: кароў ад 1 за 3 гадоў 999 і коняй ад 2 да 4 год 635. Памяншэньне абкладаемай жывёлы, галоўным чынам, тлумачыцца неўраджаем мінулага году, але-ж разам з гэтым трэба адзначыць, што значная частка сялянства і галоўным чынам заможнае імкнецца пры вучоце паставіць меншы ўзрост сваёй жывёлы і тым самым схаваць ад падатку.

Здавальняюча праводзіцца вучот там, дзе сельская вучотная камісія зацікаўлена сталым правядзеньнем працы і ёсьць дапамога з боку самога насельніцтва. Кепска справа з вучотам там, дзе асобныя члены вучотных камісій хочуць падмазацца пад сялянства, каб быць добрым сватам, кумам і наогул прыяцелем. Напрыклад, у аднэй з вёсак на запытаньне старшыні с.-с. колькі маецца зямлі, селянін кажа: «У мяне маецца зямлі 6.75 дз.», а сэкратар піша 6,25 дз. і на прапанову старшыні сэкратар адказвае: «Ці запішаш 6,75 дз. ці 6,25 дз., а мэдалі за гэта не заслужыш».

Гэткі выпадак у нашым раёне быў адзін.

Наогул трэба адзначыць, што вучот праходзіць здавальняюча.

Райвыканкому трэба больш зьвярнуць увагу на правядзеньне вучоту і дапамагаць практычна на мясцох.

Гартанны.

Рыхтуем зьмену.

(Барысаўскі раён).

З ліпеня месяца г. г. адчынены і распачалі працу чатыры дзіцячыя ўстановы, з якіх: дзьве—дзіцячыя пляцоўкі і дзьве—яслі. Усе яны зьмяшчаюцца ў больш населеных пунктах раёну, дзе само насельніцтва ідзе на спатканьне ім. Больш адчыніць ня было магчымасьці, бо не хапае сродкаў. На кожную ўстанову, у сярэднім, адпушчана на 250 р., з якіх каля 50 проц. выдаюць мясцовыя кааперацыйныя арганізацыі. Праца разьлічана на тры месяцы і ахоплівае да 150 чалавек дзяцей. Само сабой зразумела, што гэты лік ня можа задаволіць сучаснае запатрабаваньне вёскі даць больш разумнае выхаваньне дзецям дашкольнага ўзросту і на будучы год трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу належным ворганам на пашырэньне сеткі дашкольнага выхаваньня.

Мак.

Распрацоўку торфу—зьберажэ лясы.

(Крычаўскі раён, Магілёўскае акругі).

Зьнішчэньне лясных масываў ужо ў сучасны момант зьяўляецца пагрозай насельніцтву—застанецца бяз дроў для ацяпленьня будынкаў і лесаматар'ялу для належнага рамантаваньня і пабудовы новых.

Выхад з гэтага становішча, асабліва ў Крычаўшчыне, маецца, бо на абшарах раёну ёсьць шмат балот з тарфянымі залежамі на плошчы каля 3000 гэктараў, якая (плошча) не дае ніякай карысьці ні насельніцтву, ні дзяржаве, у тэй час калі гэтую карысьць магчыма атрымаць. Але тут патрэбна зацікаўленасьць з боку самога насельніцтва—гэта арганізацыя мэліярацыйных і торфа-распрацовачных т-ваў, якім з боку дзяржавы будзе аказвацца дапамога паводле існуючых на гэты конт законаў.

Трэці раённы зьезд саветаў Крычаўшчыны даў дырэктыву райвыканкому аб арганізацыі тарфяных т-ваў на абшарах Крычаўскага раёну.

Пры напружанай працы мясцовых працаўнікоў, а таксама і дзякуючы зразуменьню саміх сялян, дадзеныя дырэктывы 3-м раённым зьездам аб арганізацыі тарфяных т-ваў выкананы і на сёньнешні дзень у раёне маюцца 2 тарфяныя т-вы, якія ўжо распачалі сваю працу.

Першае—арганізавана ў в. Хацілавічах Сакольніцкага с.-с., з лікам пайшчыкаў 30 чал. Балота плошчай 14 гэктараў знаходзіцца паміж ворных зямель, і т-ву прышлося капаць магістральную канаву каля 2 з паловаю кілёмэтраў. У сучасны момант балота ўжо асушана і прыступілі да вырабу торфу.

Другое—у в. Прудок Крычаўскага с.-с., у якім пайшчыкаў 20 асоб. Балота на плошчы каля 50 гэктараў цягнецца ўздоўж шляху Крычаў-Клімавічы і к сёньнешняму дню т-вам выканана магістральная канава каля 2 кілёмэтраў. На балоту ўжо магчыма хадзіць і ў недалёкім часе маецца на ўвазе распачаць выпрацоўку торфу.

Абодвым т-вам з боку дзяржавы аказана дапамога—першае атрымала крэдыт у суме 300 руб. і другое—ў суме 392 р.

27 чэрвеня г. г. адбылося ўрачыстае адчыненьне гэтых т-ваў. Настрой членаў т-ваў бадзёры, што магчыма было заўважыць з іх адказаў на прывітальныя прамовы працаўнікоў раённых устаноў, якія выказвалі сваю думку, што гэтыя т-вы зьяўляюцца штурхачом у справе правядзеньня мэліярацыі на Крычаўшчыне.

Маючы на ўвазе забясьпечанасьць збыту торфу ў Крычаўшчыне (бо ў раёне маюцца 2 бровары, лесапільны завод, а таксама і раённыя ўстановы, якія можна перавесьці на тарфянае ацяпленьне) магчыма чакаць добрых вынікаў у працы тарфяных т-ваў.

Трэба спадзявацца, што сялянства суседніх вёсак возьме прыклад з першых т-ваў і дапаможа ўладзе ў правядзеньні мерапрыемстваў па індустрыялізацыі прамысловасьці і інтэнсыфікацыі сельскай гаспадаркі.

Ф. А.

Ахова здароўя ў вёсцы.

Недахваты ў больніцы трэба зьнішчыць.

(Самахвалавіцкі р., Меншчына).

Самахвалавіцкая райбольніца знаходзіцца ў 5 кілёмэтрах ад раённага цэнтру ў в. Пяцяўшчыне. Дзякуючы такой адлегласьці, няма магчымасьці тым ці іншым установам наглядаць за яе працай.

У выніку чаго былі дрэнныя адносіны мэдпэрсаналу да хворых, (напр. аптэкар, які за каўнер выводзіў сялян прыходзіўшых за мэдыкамантамі). Мэдпэрсанал зусім ня выконваў загадаў загадчыка больніцы.

Наогул, справы былі вельмі дрэнныя, пакуль РВК ня прыняў належных крокаў.

Нядаўна рэвізійнай камісіяй РВК была зроблена рэвізія больніцы, якая выявіла цэлы шэраг недахватаў, як, напрыклад: мэдпэрсанал карыстаецца больнічнай бялізнай—прасьцірадламі, ручнікамі і коўдрамі. Таксама карыстаюцца ложкамі, больнічнымі столікамі і табурэткамі, у той час, калі інвэнтару не хапае для хворых. Усе недахваты рэвіз. камісія занесла ў акт.

Каб гэтыя недахваты зьнішчыць, РВК неабходна прыняць адпаведныя меры.

Неабходна справу ў больніцы паладзіць так, каб хворы не адчуваў сябе баязьлівым і не хадзіў з заявамі ў РВК, як гэта было да гэтага часу, а дзеля гэтага трэба ўзмацніць культпрацу больніцы, а таксама неабходна ставіць справаздачы больніцы перад грамадзкімі арганізацыямі і наогул прыблізіць працу больніцы да шырокіх колаў насельніцтва.

Неабходна зьнішчыць зьявішча карыстаньня больнічнымі рэчамі, а таксама, здаецца, не павінна быць зьявішч, калі выяжджае той ці іншы ўрач і звозіць з сабою бялізну, як урач Фейгін, які зьвёз у Менск больнічнае прасьцірадла і ручнік.

Больніца мае вельмі шмат недахватаў і іх трэба як мага хутчэй зьнішчыць.

Б. К.

Вынікі беларусізацыі.

(Талачынскі раён, Аршаншчына).

Раённая нац. камісія, праверыўшы працу ўстаноў, выявіла, што ўсе галоўныя ўстановы працуюць на беларускай мове, і што кожны, хто зьвяртаецца да іх, атрымоўвае адказ на сваей роднай мове.

Райком КП(б)Б вядзе працу выключна на беларускай мове, таксама і РВК за выключэньнем грашовай і вайсковай частак, дзе знойдзена некалькі перапісак на расейскай мове.

Страхагэнцтва вядзе сваю працу пераважна на расейскай мове. Міліцыя, суд, пракуратура і нарсьледчы заключэньні і акты абвінавачваньня пішуць пабеларуску. Агульная перапіска і кнігі вядуцца на беларускай мове.

Яўрэйскае насельніцтва не абслугоўваецца на роднай мове, за выключэньнем нарсьледчага.

Мэдпункт, больніца і аптэка зусім ня ўжываюць беларускай мовы. Яўрэйскае саматужнае ашчадна-пазыковае таварыства, якое абслугоўвае 96 проц. яўрэяў, усе справы вядзе на беларускай і расейскай мовах.

КСУ ўсе справы вядзе на беларускай мове і прафарганізацыі таксама, але апошнія гутараць пабеларуску мала. Прафсаюз скурнікаў добра наставіў абслугоўваньне сваіх сяброў на роднай (яўрэйскай) мове.

У РК ЛКСМБ справы вядуцца на беларускай мове. Таксама добра абслугоўваюцца і другія нацменшасьці. Практычная прапанова нацкамісіі: 1. Усім раённым установам да 1-VIII г. г. перайсьці на беларускую мову. 2. Супрацоўнікам устаноў гутарыць пабеларуску і прыняць крокі дзеля абслугоўваньня нацменшасьцяў.

С. Парфіяновіч.

К. ТАБОЛАЎ.

Аб нацыянальнай культуры, аб украінізацыі і аб літаратурнай істэрыцы Ваганяна і Ларына *).

Ваганян і яго правая ісьнасьць пад левай фразай.

Глыбока памыляецца Ваганян і тады, калі дапушчае, што зараз барацьба ў галіне культуры адбываецца паміж нацыянальнай і інтэрнацыянальнай культурамі. «Барацьба клясаў у культуры якраз і выяўляецца ў барацьбе **між нацыянальнай культурай і культурай інтэрнацыянальнай**, між грамадзкасьцю нацыянальнаю і грамадзкасьцю клясаваю» [1]).

Гэта— няправільная фармулёўка. Няправільная хоць-бы таму, што **ўнутры самой нацыянальнае культуры адбываецца клясавая барацьба.** Дый інтэрнацыянальная культура бяз усякіх супярэчнасьцяй гатовенькая з неба ня звальваецца.

Зараз у нацыянальных акраінах Саюзу пад нацыянальнай абалонкаю ідзе барацьба паміж пралетарскаю і буржуазнаю культурамі. Пры савецкай уладзе не задача партыі пралетарыяту весьці барацьбу супроць нацыянальнае формы. Самае істотнае для нас—**клясавы зьмест.** І тут магчыма і нават месцамі няўнікнёна падмена пралетарскага зьместу буржуазна-нацыяналістычным.

Калі т. Ваганян змагаецца супроць такога сьвядомага і несьвядомага буржуазнага скажэньня лініі партыі,—гэта добра. Мясцовы нацыяналізм, зразумела, вырас за апошнія гады, і з ім трэба весьці рашучую барацьбу. Але асобныя скажэньні пры агульнай правільнай палітыцы нам ня страшны.

Больш сур'ёзна стаіць пытаньне аб росьце яўна-буржуазных і рэакцыйных элемэнтаў сярод асобных нацыянальнасьцяй. Напр., за апошні час мы зьяўляемся сьведкамі аграмаднай актыўнасьці мусульманскага духавенства і кулацтва Татарстану. Там муллы пашыралі сетку рэлігійных школ, уплывалі (у большасьці праз жанчын) на перавыбары саветаў, патрабавалі раўнапраўя мулл з сялянствам, спыненьня антырэлігійнае прапаганды і г. д. Вось адкуль нам пагражае небясьпека. І ківаньне часткі прафэсуры грузінскага унівэрсытэту ў бок францускае мовы, а групы украінскіх таварышоў у бок культуры Захаду, зьяўляюцца зьвеньнямі аднаго ланцугу. Аднак, усё гэта гаворыць толькі аб тое, што з часу XII партзьезду ў нас **значна вырас мясцовы нацыяналізм, хоць ён далёка яшчэ не перарос вялікадзяржаўны шавінізм.**

Ваганян змагаецца супроць мясцовага нацыяналізму, але не заўважвае, а часткай і **прыкрывае, вялікадзяржаўны шавінізм.** А што апошні жыве і добра жыве, гэта пераконваюча адзначыў т. Бухарын у «Злых заметках», і пацьвярджае жыцьцёвы вопыт.

Ваганян ня бачыць цэнтраімклівых тэндэнцый, закладзеных у істоце пралетарскае дыктатуры, асновай якіх (тэндэнцый) зьяўляецца экапамічная, фінансавая, палітычная і культурная залежнасьць акраін ад цэнтру. Апошні можа ў любы час выкарыстаць сваю магутнасьць, каб уцягваць асобныя народы ў арбіту сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта мае аграмаднае становучае значэньне. Але, было-б недарэчнасьцю не прызнаваць, што гэтыя цэнтраімклівыя тэндэнцыі пры бюракратычным апараце могуць перагнуць палку і аказаць мядзьведжую паслугу пралетарыяту.

Ларын праванує украінізацыю.

У сутнасьці, т. Ваганян «тэарэтычна», а т. Ларын «практычна» робяць адну агульную справу. Не выпадкова Ваганян працягвае руку Ларыну.

Асноўнае ў артыкуле т. Ларына (ён надрукаваны ў двух нумарох «Большэвіка»)—гэта факты. Ён прывёў іх некалькі, зусім спакойна схаваўся за імі і атакаваў тую аграмадную работу, якую вядзе партыя на Украіне. Якжа абстаіць справа з фактамі?

Сапраўднасьць часткі прыкладаў т. Ларына трэба паставіць пад сумненьне. Другая частка зьяўляецца ня вынікам украінізацыі, а тэй адсталасьці, невуцтва і бюракратызму, якія мы атрымалі ў спадчыну ад царызму і маюць месца ня толькі на Украіне. Урэшце, трэцяя частка—гэта сапраўдныя скажэньні, з якімі трэба змагацца, але іх сам аўтар лічыць няўнікнёнымі.

Тав. Ларын пачынае з адэскай камсамольскай ячэйкі. Ён на аснове газэтнае заметкі сьцьвярджае, што большая частка яўрэйскае моладзі ячэйкі не ўладае роднай мовай, а райком праз сэкратара ячэйкі навязвае апошняй яўрэйскую мову. Тут аўтар выяўляе факт прымусовай яўрэізацыі і на ім будуе цэлую «тэорыю» шавінізмаў, нацыяналізмаў ды інш. «ізмаў». Аднак, на тых матар'ялах, якія ў нас ёсьць пад рукамі, можна ўстанавіць, што ў камсамольскай ячэйцы 1-й дзяржаўнай кансэрвавай фабрыкі, пра якую ідзе мова ў т. Ларына, **толькі 12 проц. яўрэйскае моладзі не ўладаюць яўрэйскай мовай.** Такім чынам, асноўны і выхадны факт Ларына адпадае, і разам з ім аказваюцца неабгрунтаванымі абвінавачваньні украінскіх работнікаў у прымусовай яўрэізацыі і інш. сьмертных грахох. Адпадаюць і абвінавачваньні Ларына, асноўаныя на яўрэізацыі. А іх цэлы тузін: шавіністычнае русафільства, антысэмітызм, падрыўная работа супроць савецкай улады, спробы адвучваньня яўрэяў ад расейскае мовы шляхам яўрэізацыі, імкненьне з боку дробнае буржуазеі аслабіць канкурэнта, імкненьне да таго, каб пазбавіцца ад канкурэнцыі яўрэяў у справе абслугоўваньня гораду і вёскі і г. д.

На працягу дзьвюх старонак Ларын высунуў гэтую сэрыю небясьпек і ўхілаў супроць распаўсюджваньня роднае мовы сярод яўрэяў. А вось тое, што летась большасьць яўрэйскіх працоўных, 58,5 проц. членаў прафсаюзаў яўрэяў (звыш 100 тысяч чалавек), паказалі роднай мовай яўрэйскую, аб гэтым Ларын нічога ня хоча ведаць.

Ня менш важкім аргумэнтам для т. Ларына паслужылі тыя чуткі, якія распаўсюджваюцца па Савецкім Саюзе вакол ненармальных зьяваў пры правядзеньні украінізацыі. Можна з упэўненасьцю сказаць, што Ларын (а з ім яшчэ многія), на вялікі жаль, знаходзіцца ва ўладзе гэтых **чутак**. Ён нават рабіў спробу давесьці верагоднасьць і справядлівасьць гэтых чутак. Дзеля гэтага ён камэнтыруе ліст аднаго расейскага пралетарыя, які працуе на Украіне. «Пятнаццаць год свайго **сьвядомага** жыцьця я ўдзельнічаў у партыйных арганізацыях на тэрыторыі Украіны,—піша гэты рабочы,—і раптам мы адразу перасталі разумець даклады, газэты і г. д... Ці-ж гэта падобна на ленінскую нацыянальную палітыку»—пытаецца аўтар ліста. А Ларын адказвае: «Не, зразумела, не падобна» [1]).

Мы, аднак, сумняваемся ў тым, каб пралетары-рэвалюцыянэр 15 год пражыў **сьвядомым жыцьцём на тэрыторыі Украіны і ня ведаў украінскае мовы.**

Сапраўды, як-жа украінскія рабочыя і сяляне, не пралетары, а «хахлы», як яны на тэрыторыі Украіны дзесяткі год разумелі расейскую мову і не заставаліся няпісьменнымі? А гэта-ж было магчыма пры царызьме. Чаму-ж зараз, пры савецкай уладзе, расейскія пралетары (ды лічэ партработнікі) ня могуць вывучыць украінскай мовы? Мы бачым у лісьце, прыведзеным т. Ларыным, **ноткі вялікадзяржаўнага каленізатарства.** І Ларыну належала-б ня ісьці ў хвасьце гэтых чутак, не раздуваць іх, а зьнішчаць іх у корані. Так абстаіць справа з многімі фактамі Ларына.

У прынцыпе супроць украінізацыі Ларын ня супярэчыць. Наадварот, ён нават лічыць неабходнай **прымусовасьць** у пытаньні вывучэньня украінскае мовы служачымі некаторых публічна-прававых органаў дзяржавы. Ён і ня супроць украінскае мовы, ён за тое, каб усе служачыя дзяржапарату «пазнаёміліся» з ёю. Дзіўны тэрмін, які скланяе аўтар направа і налева! Калі ж т. Ларын ставіць пытаньне ў плашчыню практычнага вырашэньня, то яму прыдаюцца «**элементы разложения**», «магчымасьці палітычнага перараджэньня пралетарыяту»,«небясьпекі выраджэньня прафсаюзаў у бюракратычныя арганізацыі» і г. д. і г.д. Дзіўнае становішча ўтвараецца ў т. Ларына. З аднаго боку, трэба прызнацца, з другога боку, нельга ня прызнацца.

Украінізацыя увогуле, у абстракцыі—рэч ня дрэнная, але украінізацыя сучасная на тэрыторыі Украіны нясе небясьпекі распаду. У сьмешнае становішча пападае Ларын.

У сваім месцы мы паказалі, што Ваганян упарта маўчыць аб тэй аграмаднай пазытыўнай рабоце, якая разварочваецца сярод розных нацыянальнасьцяй Саюзу.

Тав. Ларын у больш асьцярожнай форме, але па сутнасьці справы пашоў па сьлядох Ваганяна. **Для яго гіганцкая культурная работа працоўных Украіны праходзіць бясьследна і застаецца неацэненаю.** Затое аўтар з пачатку свайго артыкулу заклікае да «ужыцьця ўлады», пагражае «умяшацельствам зьверху» і ў канцы заяўляе: «Але цяпер пара ўжо ад «**гістарычных аб'ясьненьняў перайсьці да зьмены практыкі**» [1]). Што значыць «умяшацельства зьверху»—цяжка зразумець. Але лёзунг «да зьмены практыкі» у сувязі з нядвохзначнымі абвінавачваньнямі партарганізацыі замяняецца ў поўную палітычную формулу. **Для украінскага будаўніцтва гэтыя абмоўкі і нядзьвюхзначныя заявы азначаюць: прэч украінізацыю, няхай жыве русыфікатарства!**

Гэткі вывад, уласна, і зрабілі на Украіне з артыкулу т. Ларына. Аўтары цэлага раду пісем у ЦК УсеКП(б), у рэдакцыю «Большэвіка» і асабіста т. Ларыну даводзяць, што пасьля зьяўленьня артыкулу ўзьніклі некаторыя ваганьні ў радох пэўнага кола партработнікаў адносна украінізацыі. **А што тычыцца вярхоў расейскага чыноўніцтва, то яны адкрыта паднялі галаву.** Ды гэта і зразумела, бо з гэткімі пытаньнямі, як нацыянальнае, **жартаваць нельга.** Там, на Украіне, партыя праводзіць аграмадную і надзвычайна складаную працу, а т. Ларын сваімі выступленьнямі **дэзарганізуе волю цэлай арганізацыі і лье ваду на млын яўных ворагаў партыі.** А што расейскі бюракрат на Украіне ня міраж, а рэальны і істотны факт, накіраваны супроць украінізацыі, у гэтым лёгка можна ўпэўніцца. Пачытайце нумар «Киевского Пролетария» за 27 лістапада мінулага году і вы ўбачыце, што нават у часе праверкі веданьня украінскае мовы наглядаліся варожыя адносіны некаторых служачых да украінізацыі. Яны выявіліся «**у насьмешках над украінскай мовай**, у адмоўных іх (некаторых служачых) адносінах да пытаньня аб вывучэньні мовы і ў адмоўным **уплыве** на іншых служачых, якія хацелі вывучыць мову». Штосьці гэта не падобна на дзеяньні «пакрыўджаных авечак», **расейскіх чыноўнікаў, якіх узяў пад абарону т. Ларын.**

Мы-ж у кожным разе не бяром пад абарону асобныя глупствы і сьвядомае скажэньне ў пытаньні украінізацыі. Яны сапраўды няўнікнёны, асабліва ва ўмовах слаба-пралетарызаванай, нацыянальна-перамяшанай, некалі прыгнечанай, асабліва пасьля пятлюраўскай Украіны. На асобных вучастках культурнага фронту нават няўнікнёны правалы і часткове ўзмацненьне нацыяналістычнай інтэлігенцыі. Усё гэта няўнікнёна, супроць гэтага барацьбу весьці трэба, але ня ў гэтым сэнсе спрэчкі.

Праблема украінізацыі рэч больш сур'ёзная, чымся думаюць іншыя таварышы, у тым ліку і камуністы. У нас даволі многа гавораць пра змычку рабочае клясы і сялянства. Аднак, вельмі часта гэту ідэю забываюць як раз там, дзе яе можна ажыцьцёвіць з нясумненным посьпехам. На Украіне пераважаюць расейскія рабочыя. Ім замест ўцёку з Украіны належыць прыняць самы дзейны і кіраўнічы ўдзел у правядзеньні украінізацыі, замест «знаёмства» з мовай, яны павінны яе вывучыць і перамагчы.

На Х-м зьезьдзе партыі т. Сталін сказаў: «Нядаўна яшчэ гаварылася, што украінская рэспубліка і украінская нацыянальнасьць—выдумка немцаў. Між тым ясна, што украінская нацыянальнасьць існуе, і разьвіцьцё яе культуры складае абавязак камуністаў» [1]). Зараз мы можам дабавіць, што правядзеньне украінізацыі—рэвалюцыйны і проста абавязак камуністаў і рабочых, раней усяго тых расейскіх пралетарыяў, якія працуюць на тэрыторыі Украіны. Яны павінны зрабіць усё ад іх залежнае, каб утварыць дзелавую і таварыскую атмасфэру пры правядзеньні украінізацыі, па магчымасьці ўзяць яе пад свой уплыў і кіраўніцтва.

(Канец).

*) Пачатак гл. „Сав. Бел.“ № 150.
[1]) Ваганян, стар. 22. Курсіў аўтара

[1]) «Большевик» № 23-24, 1926 г., ст. 55

[1]) «Большевик». № 1 1927 г. стар. 68.

[1]) І. Сталін, «Зб. арт. па нац. пытаньні». Тыфліс, с. 127.

Барацьба з бюракратызмам.

Восем тысяч рублёў страты!

(Рэвізія Наркамзему).

Матар'ялы фінансава-кантрольнага кіраўніцтва па рэвізіі Наркамзему сьведчаць аб тым, што ў апошнім у шматлікіх выпадках наглядалася даволі беспадстаўнае парушэньне дырэктыў па рэжыму эканоміі.

З выдаткаў за лік каштарысных сум зьвяртаюць на сябе ўвагу выпадкі парушэньня норм заработнае платы, якія мелі месца ў выглядзе простага павялічэньня пэнсіі асобным працаўнікам, у выглядзе штучнага павялічэньня шляхам выдачы асобнае ўзнагароды за зьдзельную працу ці выдачы асобным служачым за лік пазабюджэтных сродкаў сум у якасьці дапамогі.

Найбольш яскравым прыкладам зьяўляецца выдача ўзнагароды адказным працаўнікам НКЗ у суме 1.850 руб. за складаньне Водна-мэліарацыйнага Кодэксу, прычым гэтая ўзнагарода была выдана такім працаўнікам, як загадчык аддзелу мэліарацыі, інспэктар па мэліарацыі, кансультанты,—у чые абавязкі непасрэдна ўваходзіла гэтая праца. Фармальнаю падставаю гэтага выдатку зьявілася тое, што па каштарысе НКЗ былі прадугледжаны сродкі на запрашэньне асобных спэцыялістых для апрацоўкі і кансультацыі, якія НКЗ і скарыстаў на выдачу сваім адказным працаўнікам.

Такім-жа прыкладам зьяўляецца выплата розьніцы ўтрыманьня быўш. прадстаўнікоў НКЗ у Маскве ў суме 156 руб. 25 кап. Справа ў тым, што ў працягу мінулага году НКЗ трымаў свайго прадстаўніка ў Маскве, якому выплачваў пэнсію ў разьмеры партмаксымуму па гор. Маскве. З 1-га кастрычніка 26 г. пасада прадстаўніка на штатах НКЗ была скарочана, а сам прадстаўнік перайшоў на працу ў сталае прадстаўніцтва БССР, дзе і атрымліваў пэнсію (175 руб.). Між тым НКЗ выплаціў яму розьніцу паміж акладамі з 1-га кастрычніка 1926 г. да 6-га студзеня 1927 г. ці, іначай кажучы, павялічыў яму за гэты час пэнсію, прызначаную па яго працы ў сталым прадстаўніцтве.

Дарожныя выдаткі НКЗ у асобных выпадках былі яўна немэтазгоднымі, як, напрыклад: аплачваліся дарожныя выдаткі тарфмайстру, які камандыраваўся ў друкарню дзеля атрыманьня надрукаванага там пэрспэктыўнага пляну НКЗ; аплачваліся дарожныя выдаткі аднаму лясьнічаму, які быў камандыраваны на працу ў лясьніцтва, дзе працы для яго ня было; аплачваўся агранам, які езьдзіў у Маскву на зьезд ОЗЭТ у якасьці прадстаўніка не НКЗ, а «БЕЛОЗЕТ».

Адносна зьместу выдаванай НКЗ літаратуры быў адзначаны ўхіл выдавецтва НКЗ у асобных выпадках ад тэй мэты, дзеля якой яно, наогул, існуе; напр., была выдана брашура «Пералік існуючага зямельнага заканадаўства», якое зьмяшчае ў сабе толькі назвы-загалоўкі пастаноў і абежнікаў, выданых па зямельных пытаньнях і ў такім выглядзе зусім некарысная для шырокіх колаў сялянства.

Апрача каштарысных сродкаў, НКЗ уладаў цэлым шэрагам пазабюджэтных сродкаў, якія, наогул, выдаткоўваліся бяз усялякага каштарысу ці пляну—выпадкова. Частка гэтых сродкаў ня мела ніякіх законных падстаў і належала замест расходваньня звароту ў прыбытак скарбу. За кошт гэтых сродкаў дапускаліся розныя выдаткі, якія нельга было аднесьці на каштарыс, як датацыя да асноўных ставак заработнае платы, дапамогі і г. д.

Поруч з прыведзенымі прыкладамі парушэньня норм і правіл бюджэтнае дысцыпліны была заўважана безгаспадарчасьць у карыстаньні сродкамі.

Наркамзем выкарыстаў сваю магчымасьць атрыманьня ад падпарадкаваных яму гаспадарчых установ (Цэнтразямсклад і аддзел лесараспрацовак) 5.000 руб., на якія... купіў аўтамабіль. Да гэтага трэба дадаць, што ніякіх сродкаў па каштарысе ня толькі на куплю аўтамабіля, але і на яго ўтрыманьне адпушчана ня было, і што НКЗ ужо меў адзін аўтамабіль, які ў працягу ўсяго папярэдняга году рамантаваўся, на што затрачана 1.180 руб. Дзеля таго, што ніякага акту прыёмкі рамонтных работ ці абгляду рамонту няма, у якім выглядзе прыпяты аўтамабіль з рамонту, засталося для кантролю невядомым.

Фін. кантрольнае кіраўніцтва прыняло цэлы шэраг мерапрыёмстваў дзеля зьнішчэньня азначаных хібаў, запрапанована ўдасканаліць арганізацыйную справу выдавецтва і матар'яльна-бухгальтарскі вучот маемасьці; пакрыць за кошт вінаўных яўна немэтазгодна зробленыя затраты ў суме каля 300 руб.; забаронена карыстацца спэцыяльнымі сродкамі дзеля пазычковага іх выдаткаваньня; забаронена, наогул, карыстацца часткаю пазабюджэтных сродкаў і запрапанована здаць іх у прыбытак скарбу і інш. Пытаньне аб адказнасьці за парушэньне ў часьці выдаткаў з фонду заработнае платы, апэрацый з аўтамабілямі і выдаткаў з пазабюджэтных сродкаў перадаецца на разгляд вышэйшых установ.

В. М.

Цяпер я прызнаў прыказкі і „дэ-юрэ“.

Я заўсёды недаверліва адносіўся да розных прыказак. Мне яны заўсёды здаюцца гіпэрбалічнымі. Так і бачыш аўтара іх, які мае слабасьць пераўвялічыць факты. Ну, вось, прыкладам, такая прыказка, як: «прымусіш дурнога богу маліцца, дык ён лабэсіну расшыбе». Ну, пры чым тут лабэсіна, і чаму яе абавязкова трэба біць? Ды няўжо-ж дурны не адчувае болю?

Вось так сабе, узяў дый склаў нехта прыказку, падпусьціўшы гіпэрбалы. Каб сьмяшней было, ды ямчэй. І на анэкдот каб падобна было. Таму я прызнаю прыказкі толькі «дэ-факто».

Вось і з конаўкай гэтай. Далібог-жа я ня даў веры. Проста, думаў, анэкдот апавядаюць. Але-ж пераканалі мяне—друкаваны загад па Заходніх чыгунках № 372 ад 21 чэрвеня бягучага году паказалі. А ў «докумэнце» гэтым надрукована наступнае: «12 студзеня г. г. на ст. Верайцы Зах. чыг. з залі 3 клясы невядомай асобай была скрадзена адна конаўка для піцьця вады. Аб пакражы конаўкі начальнікам гэтай станцыі быў складзены акт, які, разам з ведамасьцю звароту інвэнтару за студзень м-ц, быў прадстаўлены ў аддзел эксплёатацыі на прадмет сьпісаньня конаўкі з вучоту. Атрымаўшы акт, памочнік начальніка лічэбнай часьці названага аддзелу тав. Ваўчок зьвярнуў яго назад начальніку станцыі для афармленьня згодна загаду № 61 ад 1924 г. А згодна загаду № 61 трэба было падаць дэпешу мясцоваму агенту ДПУ і свайму бліжэйшаму начальніку са здымкам фін. камэрц. аддзел. Іншымі словамі, т. Ваўчок хацеў добра богу памаліцца, дык уздумаў лабэсіну расшыбіць. Але... не пашоў яму насустрэчу начальнік ст. Верайцы—начуў, што дрэнным нечым аддае ад такой справы, данёс у аддзел, што ён ацаніў конаўку ў 4 1/2 капейкі і замест пасылкі дэпеш—купіў новую за свае грошы. Так лабэсіна Ваўчка засталася не кранутай і то толькі дзякуючы нявэтлівасьці начальніка станцыі, які не пашоў яму насустрач у гэтай справе. Праўда, лабэсіна атрымала пстрычку ў выглядзе вымовы, адданай у загадзе, але гэта далёка стаіць ад расшыбеньня. На гэты раз бог мілаваў.

Але бывае, што людзі пападаюць нагэтульки ўпартыя, што па некалькі разоў імкнуцца расшыбіць сваю няшчасную лабэсіну. Так было з адміністрацыяй Асіпавіцкага дэпо. Калі тут памёр адзін рабочы, дык адміністрацыя запоўніла картку на звальненьне яго з пасады і «згодна з існуючымі палажэньнямі» накіравала яе ў мясцком, які, як прафорган, павінен быў узгодніць звальненьне таго, хто сам ужо зволніў сябе і спрачацца ня мае магчымасьці... Картку зьвярнулі назад. Яна хадзіла між канторай дэпо і мясцкомам тры разы. Ледзь удалося мясцкому пераканаць адміністрацыю ў непатрэбе расшыбеньня лоба.

Вось гэтыя два факты і мяне пераканалі. Пераканалі ў тым, што вельмі мудрыя нашыя прыказкі. І ніякай гіпэрбалы ў іх няма. І складаў кожную з іх чалавек зусім скромны, які ня любіць пераўвялічэньняў.

«Воистину»—«прымусіш дурнога богу маліцца, дык ён і лабэсіну расшыбе»...

Явар.

Усё гэта за 47 кап.

(Чарэйскі р., Аршаншчына).

Бюракратызм бюракратызму розь. Бывае бюракратызм лёгкага палёту, а бываюць простыя зьдзекі.

Лясьніцтвы складаюць пратаколы на парубшчыкаў часам ня ўпікаючы ў тое, што бывае вартасьць затрачанага часу на пратаколы ў 10 і больш раз даражэй парубленага лесу. Канкрэтны прыклад:

На гр-на в. Деньгубка, Чарэйскага раёну, Рыгора Сьвідэрскага складзен пратакол за парубку лесу на 47 кап. Пасьля чаго завязваецца наступная пісаніна:

Лясьнік, знаходзячы парубку, піша пратакол. Дапытваецца парубшчыка і апісвае яго маемасьць; пратакол навіроўваецца ў лясьніцтва, дзе запісваецца ў 5-6 кнігах і ў выніку накіроўваецца ў РВК для накладаньня адміністрацыйнага ўзысканьня. Райвыканком разглядае гэта на пасяджэньні прэзыдыуму, перад гэтым пратакол запісваецца яшчэ ў некалькіх кнігах. Асобнай паперай апавяшчаецца лясьніцтва, а пратакол накіроўваецца ў міліцыю для ўзысканьня. Міліцыянэр закладвае каня, або бывае і пяшком уходзіць атрымліваць грошы. Бывае добра, калі з першага разу ўдасца яму атрымаць грошы, а то па некалькі раз бывае ў парубшчыка.

Уже ўзысканыя грошы накіроўваюцца ў грашовы аддзел, дзе іхноў пачынаецца працэдура з квіткамі, ардэрамі і прыходна-выдатковымі кнігамі.

Здаўшы грошы, міліцыя паведамляе, што ўсе 47 кап. узысканы і здадзены над квіток нумар такі-та, а ў міліцыі таксама кнігі, рэестры і адметкі ёсьць, і ўсё гэта за 47 кап.

Вось табе і рэжым эканоміі!

Трэба тэрмінова перагледзець усю гэту сыстэму і упросьціць яе.

М. Ежоў.

Жыцьцё і праца асьветніка.

РАМОНТ, АПАЛ і ДРУГАГОДНІКІ Ў ШКОЛЕ

Другагодніцтва займае ў нас пачэснае месца: патрабуе каля 1.000.000 руб., загружае школу вучнямі, перашкаджае вядзеньню занятка́ў. Другагодніцтва мае шмат падстаў: дрэннае матар'яльнае становішча бяднейшай часткі сялянства, якое аддае дзяцей у пастушкі і падпаскі да першага сьнегу (гэтыя дзеці позна прыходзяць у школу, адстаюць ад сваіх сяброў і застаюцца на другі год), адсутнасьць цёплай адзежы і абутку, удзел дзяцей у хатняй працы, далёкая аддегласьць ад школы і г. д.

Не апошняе месца ў другагодніцтве займаюць рамонт і апал школ. Калі пералічаныя вышэй прычыны аказваюць свой уплыў на частку вучняў, то халодная школа аднолькава адбіваецца на ўсіх дзецях: павялічваючы значна колькасьць другагоднікаў, яна зьяўляецца прычынаю адсталасьці ўсіх вучняў, прычынаю нявыканаваньня праграмы. Калі мы ня можам яшчэ даць бяднейшаму насельніцтву матар'яльнай дапамогі, каб палепшыць наведваньне дзяцей у школы; ня можам пабудаваць пры школах інтэрнаты для дзяцей з далёкіх вёсак, ня можам даць дзецям гарачую яду і г. д., то ў сэнсе рамонту і апалу, хоць невыстарчальна, праца вядзецца і трэба прыдаць ёй больш плянавасьці, паглыбіць яе.

У правядзеньні рамонту да гэтага часу наглядалася саматужніцтва. Ніякай плянавасьці ня было. Праводзіўся не рамонт, а затыканьне дзірак, як баба затыкае анучаю, выбітую шыбу. Такі рамонт, акрамя лішняй траты сродкаў, нічога не даваў, бо заткнутая дзірка ў адным годзе к другому навучальнаму году рабілася яшчэ большаю. Трэба ў рамонце ўвесьці плянавасьць і памятаць: «лепш менш, ды добра».

Яшчэ горш стаіць справа з апалам. Да гэтага часу школы ня мелі сухіх дроў. Дровы загатаўляліся ў лістападзе-сьнежні сырыя і паліць такімі дровамі нельга. Дроў расходзілася шмат, а цяпла было мала. Норма дроў таксама малая і іх не хапае. А аб самой загатоўцы і гаварыць ня прыходзіцца. Папершае, кубатура вылічваецца на пні і, у большасьці, патрэбнай колькасьці не хапае. Падругое, на дровы вызначаецца ўсё тое, што ня можа быць выкарыстана на будаўнічы матар'ял. Калі сухое дзерава гадзіцца на жэрдку, ці з яго можна выразаць кавалак, мэтры тры, на што колечы прыгоднае, то гэта дзерава ўжо лічыцца страявым і, у выніку, дрывяныя пні раскіданы па ўсім лесе, так што ня рэдкасьць, калі адзін пень будзем шукаць паўдня, ды бяз жадных вынікаў. Ды і ня дзіва, калі бывае, што дравяных пнёў у квартале 4 і іх усе возьмеш на адзін воз. Загатовіць і вывезьці такія дровы, ды яшчэ, можна лічыць, бяз жаднай платы, нельга. Бывае часта, што дровы вызначаюцца далёка ад школы, у балоце.

Гэта пытаньне трэба ўпарадказаць, бо калі Наркамзем эканоміць на гэтым капейкі, то Наркамасьветы аддае лішнія рублі.

Над гэтым якраз сваячасова падумаць, калі пачынаецца падрыхтоўка да наступаючага навучальнага году, бо праз месяц-два, будзе позна.

Урэгуляваньнем гэтых пытаньняў мы зьнішчым значны процант другагоднікаў.

У. С.

Настаўніцтва на перападрыхтоўцы.

(Віцебск).

Перападрыхтоўка вясковага настаўніцтва з кожным годам атрымлівае больш плянавы і сыстэматычны характар. Для перападрыхтоўкі настаўніцтва Віцебшчыны адчыніліся ў Віцебску 6 тыднёвыя курсы. На курсы было вызначана 60 чалавек, але прыехала і жадала працаваць значна больш. Гэта зьяўляецца добрым паказчыкам таго, наколькі наша вясковае настаўніцтва зацікаўлена сваёй перападрыхтоўкай. Курсы адведвае шмат вясковага настаўніцтва, якія жывуць у Віцебску на свой кошт.

Курсы працуюць у белпэдтэхнікуме і карыстаюцца лябараторыямі і дапаможнымі матар'яламі тэхнікуму.

Праграма сёлетніх курсаў мае ўхіл у бок распрацоўкі мэтодык выкладаньня прадметаў пачатковай школы і ў гэтым яе каштоўнасьць для вясковага настаўніка.

Пры курсах ёсьць практыкавальная школа, дзе настаўнікі—курсанты даюць практычныя ўрокі, якія потым даволі жыва і дзелавіта крытыкуюцца іншымі курсантамі-гледачамі.

Акрамя працы па выкананьню праграмы, слухачы курсаў утварылі і агульна-асьветныя гурткі.

Наогул, настрой у настаўнікаў—курсантаў добры і ахвота да працы ёсьць.

В. Я.

На беднага асьветніка і абаронца празэў рушыцца.

(Нойданаўскі р., Меншчына).

Надоечы ў нашым с-савеце па заданьню РВК раённым сьледчым праводзіліся абсьледваньне з удзелам рэвізійнай камісіі с-с. Праца па абсьледваньню цягнулася ад 12 гадзін дню да 7-й гадзіны раніцы бяз жаднага перапынку. Падагульваючы недахопы ў працы с.-с., тав. сьледчы абурыўся на настаўніцтва, абзываючы іх дармаедамі і што яны ніякай пазашкольнай працы не вядуць. Тут-жа адзін з 2-х настаўнікаў, удзельнічаўшых у працы, як прадстаўнік ад рэвізійнай камісіі, ня вытрымаў. Нэрвова дастае з кішэні пасьведчаньне на права водпуску з 1 чэрвеня па 1-га жніўня г. г. і разам-жа з гэтым дастаючы два мандаты акруговага і ўсебеларускага зьездаў упаўнаважаных с-г. кааперацыі, якія адбыліся з 2-VI—9-VI. затым ведамасьць рэвізіі тавараў адной з крам спажывецкага т-ва, кажа:

— Як па вашаму, тав. сьледчы, гэта чым можна назваць?

А гэта, што разам з вамі не адпачываючы і хвілінкі прыходзіцца працаваць 20 гадзін па абсьледваньню с-савету, пад які параграф працы аднесьці? Тав. Ярмаленка нічога не адказаў на гэта, але, зрабіўшы кісла-сур'ёзна-сьледчую міну, безнадзейна, махнуў рукой у бок дармаеда-настаўніка. Крыўдна стала настаўнікам і яны зморана разьвітваючыся заўважылі горка адзін аднаму: «На беднага вясковага настаўніка, дык і абаронца рэв. законнасьці рушыцца».

Настаўнік з вёскі.

Крытыка „саматужніка“.

(Пухавіцкі р., Менск. акр.).

Такая крытыка выяўлена ў дапісе «Дзьве справаздачы», зьмешчаным у «С. Б.» № 139 ад 23-VI г. г. Гэты дапіс цалкам пабудаваны на выпадковай фразе настаўніцы на вуха аўтару памянёнага допісу—«Избиение младенцев», на лічбах нарочна зьменшаных у горшы бок і на перакручаных па свайму жаданьню паасобных фраз са справаздачы па Новасёлкаўскай сямігодцы. А таму апошнія словы «Суседа» (аўтара памянёнага допісу), што «дзьве сямігодкі (Пухавіцкая і Новасёлкаўская)—дзьве вышыні ў раёне», у чытача не знаёмага з сапраўдным становішчам Новасёлкаўскай сямігодкі, выкліча сумленьне аб «вышыні», а ў знаёмага з гэтым становішчам выклікае ўхмылку непаразуменьня.

Лічу сваім абавязкам даць правільнае ўяўленьне аб Новасёлкаўскай сямігодцы, грунтуючыся на данных з справаздачы перад РВК і на фактычных данных, дабытых з спраў сямігодкі.

Перш усяго, пры пераводзе з V кл. у VI пакінута на другі год не 23 ч., а 18, было-ж у гэтай кл. не 52 вучні, а 64. Папраўка дае зусім другія адносіны пакінутых вучняў на другі год да агульнага ліку вучняў усяе клясы. Разам з тым дае магчымасьць судзіць аб цяжкай працы ў Новасёлкаўскай сямігодцы з прычыны перагружанасьці, што бязумоўна адбіваецца на посьпехах вучняў. З VII кл. выпушчана ня 8 чал., а 9.

Проста дзіва бярэ, як хваціла совесьці ў «суседа» так нахальна маніць, абы цямнейшую пляму пакласьці на суседнюю школу!

Што датычыцца малодшых клясаў сямігодкі, якія былі ўкамплектаваны больш нармальна і дзе праца мела другія ўмовы,—маюцца і зусім іншыя вынікі. Напр., з II кл. у III пераведзены ўсе 100 проц. (31 вучань) па I кл. з 38 вуч. пераведзена ў II кл. 33, пакінута на другі год 3, а рэшта выбыла і г. д.

Прыпісваць другім свае думкі і словы, як робіць «Сусед», вельмі нягожа. У справаздачы і спрэчках імена былі толькі ўстаноўлены прычыны слабай пасьпяховасьці вучняў.

Вучнёўскае самакіраваньне. У крытыцы яго «Сусед» яшчэ больш выявіў тэндэнцыйнасьці, яшчэ больш накідаў гразі на настаўнікаў-суседзяў. Вельмі добра было відаць з справаздачы, што вучнёўскае самакіраўніцтва ў Новасёлкаўскай сямігодцы мае здаровы грунт і праца яго за год вялікая.

Палявая і агародная гаспадарка сямігодкі па «двух справаздачах» выходзіць, што неяк добра стаіць «між іншым» (так і напісаў «Сусед»). На самай справе гэта гаспадарка зьяўляецца базаю працоўнай самадзейнасьці ўсяго школьнага калектыву.

Хто скажа, што гэта школа не разьвіваецца на сапраўдным працоўным шляху, а вучнёўскае самакіраваньне ў ёй ня мае пад сабою працоўнае падваліны?

Але гэтага «Сусед» не замячае, а знаходзіць здавальненьне ў падтасаваньні ў найгоршым сэнсе слоў: «пыл», «парадак» і «чарговы настаўнік». Мала гэтага, «Сусед» і тут публікуе свае выдуманыя 130 р. прыбытку, якіх ніхто і не ўспамінаў. У справаздачы, гаварылася, што школа мела прыбытку валавага 320 р. 62 к., а з астачаю ад 1925-26 г. 326 р. 86 к.

Пра чысты-ж даход даваліся цыфры паасобных культур: картофля дала чыст. прыб. 176 р. 82 к., жыта—36 р. 96 к. і г. д..

Каб «Сусед» памарудзіўся ўсё скласьці, то атрымаў-бы чыстага даходу 213 руб. 61 к. плюс 5 п. жыта на насеньне і каля 200 п. картофлі-насеньні. Вялікая розьніца ад 130 р.! Зусім другі малюнак даходнасьці ад школьнай палявой гаспадаркі!

Зрабіўшы патрэбныя папраўкі, каб сагнаць гразкія плямы, кінутыя «Суседам» на суседку-сямігодку, падтрымліваю загадч. Пухавіцкай сямігодкі, што ёсьць настаўнікі-настаўнікі і настаўнікі-саматужнікі, чаго вельмі ня ўзьлюбіў «Сусед».

Але-ж якраз да настаўнікаў-саматужнікаў першым і належыць сам «Сусед», бо ён трымаецца правіла: [illegible] хвалю, а чужое ганю». Шыр[illegible] гляду ў яго адсутнічае, [illegible] і зьявіліся «Дзьве с[illegible]

[illegible]ар.

Школьныя справы.

(Бягомльскі раён, Меншчына).

Усяго ў раёне маецца 42 школы сацвыху, з іх 9 двохкамплектных і 1 разьвіваецца ў сямёхгодку. Па ўсіх школах навучаецца 1896 хлопчыкаў і 627 дзяўчат. Калі мы пабачым, як былі ўкамплектаваны школы, дык прыдзецца адзначыць, што частка школ была перапоўнена да адказу, а ў некаторых вучняў было менш наркамасьветаўскай нормы

Якое-ж матар'яльнае становішча нашых школ?

З агульнага ліку толькі 24 школы маюць уласныя будынкі, частка якіх патрабуюць невялічкага, а 7 школ капітальнага рамонту. Яшчэ восеньню 13 школ былі досыць добра адрамантаваны, на што было выдаткована 3017 руб. У гэты будаўнічы сэзон будуць адрамантаваны і тыя школы, якія патрабуюць капітальнага рамонту,

Горш абстаіць справа з будоўляй плянавых школ:—у гэтым годзе згодна 10 гадоваму пляну павінна было будавацца 4 школы, з іх толькі на 2 школы лесаматар'ял вывезены, а на адну яго адпусьцілі толькі ў красавіку, на другую-ж сяляне адмовіліся вывозіць. Ня зусім добра абстаіць справа і з забясьпечаньнем школ апалам. —толькі для 15 школ апошні загатоўлен на 1927-28 вуч. год, а для рэшты неабходна будзе РАНА паклапаціцца загатаваць апал увосень.

З наступнага году школы будуць досыць добра забясьпечаны ня толькі падручнікамі, але будуць у большасьці школ вучнёўскія бібліятэчкі і часткова будуць забясьпечаны вучэбнымі дапаможнікамі. Кепска толькі справа з пісьмовымі прыладамі, якія вучні набываюць самі.

Як у першым канцэнтры сямёхгодкі, так і ў двохкамплектных школах праца ішла па комплекснай сыстэме, але трэба сказаць, што за невялічкім выключэньнем уся комплексная сыстэма заключалася ў камплексаваньні кніжнага матар'ялу. Трэба будзе настаўнікам падумаць аб сваёй перападрыхтоўцы, каб з новага вучэбнага году сапраўдная комплексная сыстэма ў гэтых школах заняла належнае месца.

Бягомльскі раён знаходзіцца амаль што 150 вёрст ад свайго акруговага цэнтру і пагэтаму разьлічваць на мэтадычную дапамогу з боку акруговай інспэктуры асабліва ня прыходзіцца. Неабходна будзе Наркамасьвеце і Менскаму Акрана паклапаціцца, каб прад пачаткам вучэбнага году быў у раёне прызначаны добры мэтадысты раённы інспэктар, інакш школьная справа будзе вельмі кульгаць. З—ў.

І. БАРАШКА.

Хроніка гістарычных падзей.

Люты-кастрычнік на Беларусі і Заходнім фронце*).

Чэрвень.

4(17)-га, нядзеля. У Ленінградзе адбыўся зьезд Беларускай Сацыялістычнай Грамады, на якім прыняты праэкт новай праграмы.

У Менску адбываецца раскол «аб'яднанкі» на бальшавікоў і меншавікоў. Абіраецца гласны камітэт бальшавіцкай партыі. Прымаецца тэкст маніфэсту ад імя менскага камітэту бальшавікоў.

9 (? ст.). Сход рабочай моладзі ў Віцебску. На сходзе палажана аснова арганізацыі «Югенд Фарэйн».

18(1)-га, нядзеля. Керанскі па патрабаваньню Антанты абвясьціў наступленьне. Менскі Савет асуджае наступленьне, заклікаючы да братаньня.

Франтавыя аддзелы прымаюць рэзалюцыі супроць наступленьня.

Дэманстрацыя ў Менску супроць наступленьня і вайны.

Гістарычны дзень дзеля рэвалюцыйнага руху у Менску. Чэрвенскае наступленьне Керанскага было сарвана, дзякуючы бальшавіцкаму Менскаму Савету. Бальшавіцкія сьцягі зрываюцца меншавікамі. Такія «учынкі» меншавікоў ўзмацняюць папулярнасьць бальшавікоў.

20-(3)-га, аўторак. Адбыўся першы арганізацыйны аб'яднаны сход бальшавікоў і меншавікоў—інтэрнацыяналістаў у Віцебску.

На працягу чэрвеня у Мазырскім і Барысаўскім паветах адбываюцца захапленьні памешчыцкай зямлі, парубка панскіх лясоў, пакосы і патравы.

Ліпень.

2 (15)-га, нядзеля. Другі арганізацыйны аб'яднаны сход бальшавікоў і меншавікоў-інтэрнацыяналістаў у Віцебску. У камітэт абраны 8 бальшавікоў, 1 аб'яднанец і кандыдатамі 4 ортадаксальныя бальшавікі.

3 (16)-га, панядзелак. Утварылася фракцыя бальшавікоў Віцебскага Гарадзкога Савету.

4 (17)-га аўторак. Аб'яднанае пасяджаньне Віцебскага камітэту інтэрнацыяналістаў*) і камітэту Віцебскай арганізацыі латыскай сацыял-дэмакратыі.

5 (18)-га, серада. Пасяджаньне Віцебскага Савету Рабочых і Салдацкіх Дэпутатаў.

27 (9)-га, чацьвер. Вышаў першы нумар газэты «Звезда» (орган Менскага камітэту бальшавікоў).

Жнівень.

5-(18), субота. Першая сэсія Рады Беларускіх арганізацый у Менску, якая абрала Цэнтральную Раду і зацьвердзіла яе статут.

23-(5), серада. Урадам Керанскага забаронена выданьне «Звезды».

27-31, (ст. ст.) Контр-рэвалюцыйнае выступленьне ген. Карнілава.

28 (10), панядзелак. Абвяшчэньне ген. Карнілавым Магілеву на ваенным становішчы. Выдана пастанова аб увядзеньні ваеннай цэнзуры, забарона мітынгаў. Магілеўскі савет становіцца нелегальнай арганізацыяй.

Верасень.

3 (16), нядзеля. Арганізаваўся першы камітэт сац-дэм. (бальшавікоў) па ст. Віцебск, Рыга-Арлоўскай чыгункі.

10(23), нядзеля. Урачыстае пасяджаньне занова абранай гарадзкой думы. На пасяджаньні агалошана дэклярацыя франціі с. д. інтэрнацыяналістаў (бальшавіцкая дэклярацыя).

15(28), пятніца. Замест зачыненай па загаду Керанскага «Звезды» вышаў першы № «Молота».

Першая Паўночна-Заходняя абласная канфэрэнцыя РСДРП (бальшавікоў). На канфэрэнцыі абраны першы абласны камітэт.

16(29), субота. Мясьнікоў А. Ф. напісаў для агітацыйнай працы бальшавікоў на Заходнім фронце наступныя тэзісы: «Выйсьце адно—уся ўлада палітычная і ваенная—рэвалюцыйнай дэмакратыі».

18(1), панядзелак. Адчынены сход РСДРП інтэрнацыяналістаў Віцебску аб выбарах у Ўстаноўчы Збор, аб дзейнасьці Савету і аб сувязі з вайсковымі арганізацыямі.

Кастрычнік.

1(14), нядзеля. Першая Віцебская губэрская канфэрэнцыя бальшавікоў.

5(18), чацьвер. Другая Паўночна-Заходняя Абласная Канфэрэнцыя РСДРП (бальшавікоў) адыграла вялікую ролю ў падрыхтоўцы Кастрычніка. Пытаньне аб неабходнасьці ўтварэньня на фронце моцных узброеных сіл дзеля надыходзячай барацьбы за ўладу саветаў.

На канфэрэнцыі было прадстаўлена каля 25 тысяч членаў партыі і каля 32 тысяч спачуваючых, канфэрэнцыя вызначыла сьпіс кандыдатаў у Устаноўчы Збор па фронту, Менскай, Віцебскай, Магілеўскай губэрнях.

На Віцебскім павятовым сялянскім зьезьдзе, прынята рэзалюцыя аб выбарах у Устаноўчы Збор толькі сацыялістаў-рэвалюцыянэраў.

6 (19), пятніца. Зачынена газэта «Молот» (орган Паўночна-Заход. Камітэту бальшавіцкай партыі).

8 (21), нядзеля. Замест зачыненага «Молот» вышаў першы нумар «Буревестника».

20 (2), пятніца. Абласны зьезд саветаў і Менскі Савет бальшавікоў выпускаюць адозву да народу, у якой паказваюць, што 20-га кастрычніка выступленьня бальшавікоў ня будзе.

22 (4), нядзеля. На пасяджэньні Менскага Савету Раб. і Салдацкіх Дэпутатаў тав. Мясьнікоў зрабіў заяву: **«альбо ўся улада павінна быць рэвалюцыйна-дэмакратычнай, альбо буржуазнай, паўдарогі тут быць ня можа. Мы-ж патрабуем дыктатуры пралетарыяту і сялянства. Без Саветаў мы ня мысьлім Установчага Збору. Уся Улада Саветам».**

23 (5)-25 (7)—панядзелак-серада. Эс-эрамі склікаены ў Менску зьезд салдат-сялян Заходняга фронту.

24 (6), аўторак. У Аршанскім Савеце бальшавікамі явачным парадкам пастаўлена пытаньне аб арганізацыі Ваенрэўкому.

25 (7), серада. «Буревестник» у Менску выходзіць пад лёзунгам «Уся ўлада Саветам». Франтовы камітэт рашуча стаў супроць перавароту і бальшавікі выступілі з яго, перайшоўшы на працу ў Менскі Савет.

Раніца. Першае пасяджэньне Ваенрэўкому Аршанскага раёну.

Поўдзень. Прэзыдыум і бальшавіцкая фракцыя Менскага Савету бодрствуюць. Камітэт бальшавікоў у баявой гатоўнасьці. Атрымана ад Ваенна-Рэвалюцыйнага Камітэту ў Петраградзе радыё № 1 аб тым, што пралетарыят скінуў урад Керанскага.

Засеўшы у Магілеве у стаўцы, разам з ген. Духонінам, правыя эс-эры (Гольман, Чарноў і інш.) у той час як у Петраградзе адбываўся пераварот, рассылалі выдуманыя тэлеграмы па ўсёй краіне аб перамогах Керанскага, няўдачы перавароту, аб тым, што правінцыя і фронт не падтрымалі пераварот.

2 гадзіны дню. Прэзыдыум Менскага Савету выпушчае свой загад № 1, які быў расклеены па гораду. Загад кажа:

«У Менску ўся улада перайшла ў рукі Савету Рабочых і Салдацкіх Дэпутатаў».

Гэта была фармальная абвестка перавароту, які яшчэ не адбыўся.

2 гадзіны дню. Менскі Савет вызваліў палітычных арыштаваных з турмы і вызваленыя бальшавікі пад кіраўніцтвам прапарычыка Рамнёва з'арганізаваліся у вайсковую адзінку.

Падвечар. Усе адказныя камуністы г. Менску разьмеркаваны па ўстановах і прызначаны камісарамі, а ўсе каравулы ў горадзе заняты салдатамі 1-га Рэвалюцыйнага палка.

Увечары. Камісары, настаўленыя Саветам, прымусілі ўсіх служачых пошты і тэлеграфу застацца на сваіх мясцох.

26 (8), чацьвер. Утварэньне Ваенна-Рэвалюцыйнага Камітэту Заходняй вобласьці і фронту пры старшыні тав. Мясьнікове і сябрах т. т. Фроймане, Калмановічы, Ляндэры і інш.

27 (9), пятніца. Франтавы Камітэт утварыў «Камітэт Ратунку Рэвалюцыі».

Пры Менскім Савеце ўтвораны Рэвалюцыйны Камітэт. Старшыня Рэўкому т. Мясьнікоў.

Абвешчана пастанова Выканаўчага Камітэту Савету Заходняй вобласьці аб арганізацыі Рэвалюцыйнага Камітэту.

3 гадз. дню. Узброеная стычка ў г. Менску паміж бальшавіцкім Рэвалюцыйным Камітэтам і Менскім Саветам з аднаго боку і меншавіцка-эс-эраўскім франтавым камітэтам і штабам фронту з другога боку.

У Віцебску бальшавікамі арганізавалі Ваенна-Рэвалюцыйны Камітэт, які ўзяў на сябе палітычнае кіраўніцтва і ўсю ўладу.

Другая сэсія рады беларускіх арганізацый абрала «Вялікую Беларускую Раду».

28 (10), субота. Пасяджэньне Выканаўчага Камітэту Саветаў Заходняй вобласьці. Пацьверджана згода паміж «Камітэтам Ратунку Рэвалюцыі», Менскім Рэвалюцыйным Камітэтам і згодніцкімі камітэтамі.

Многалюднае пасяджэньне Гомельскага Савету Рабочых і Салдацкіх Дэпутатаў, якое прымае пастанову аб падтрыманьні рабоча-сялянскага ўраду.

Магілеўскі эс-эраўскі савет прыняў пастанову аб арганізацыі «дэмакратычнага міністэрства».

Апошнія дні. Усюды ўтвараюцца Валасныя Саветы. Дэкрэт аб зямлі і аграрная рэвалюцыя.

30 (12), панядзелак. Адбылося пасяджэньне Гомельскага гарадзкога Савету, на якім пасьля дакладу тав. Кагановіча прынята пастанова аб перадачы ўсёй улады ў рукі Саветаў.

31 (13), аўторак. На сходзе праўленьняў усіх прафэсыянальных саюзаў, фабрычна-заводзкіх, чыгуначных і іншых камітэтаў, большасьць прысутных стала на бок савецкай улады (Менск).

Лістапад.

1 (14), серада. Газэта «З езда» зьявілася нанава пад старою назваю.

Спроба Менскага Камітэту Ратунку ўзарваць на 708 вярсьце мосьцік, каб затрымаць браніраваны цягнік, які ішоў на дапамогу Менскаму Савету.

Каля 12 гадзін ночы к Менску падышоў прысланы арміяй на дапамогу Менскаму Савету браніраваны цягнік з многалікімі гарматамі і кулямётамі. Цягнік узяў на сябе ахову Менскага Савету і гораду.

Адчыніўся другі армейскі зьезд 2 арміі. Зьезд **выдае адозву да войска, якое ідзе на ўціхаміраньне Петраграду, з заклікам ня ісьці супроць рэвалюцыі, супроць саміх сябе.**

2(15) чацьвер. На агульным сходзе Менскага Савету ў Менскім тэатры ўрачыста агалашаецца савецкая ўлада. Меншавікі, эс-эры, Бунд зрабілі заяву аб выйсьці з Савету.

Дэлегацыя Менскага Савету Рабочых і Салдацкіх Дэпутатаў агалашае ў «Камітэце Ратунку Рэвалюцыі» заяву аб сваім выйсьці з прычыны таго, што Камітэт Ратунку парушыў згоду 27 кастрычніка.

Увечары. Агульны сход Менскага Савету Рабочых і Салдацкіх Дэпутатаў з прадстаўнікамі вайсковых і фабрычна-заводзкіх камітэтаў г. Менску. Пастаноўлена хутчэй парашыць з Камітэтам Ратунку. Дакладчык т. Мясьнікоў выкладае асноўныя прынцыпы савецкай улады.

Адозва бальшавіцкай фракцыі Франтовага Камітэту «Да ўсіх салдат фронту» з выкрыцьцем здрадніцкай палітыкі Франтовага Камітэту і зваротам да фронту **стварыць новы Рэвалюцыйны Франтовы Камітэт.**

У Менску многа трывожных чутак. Ваенрэўком Захфронту зорка сачыць за жыцьцём, парадкам і спакоем у горадзе.

У першых лічбах адбыліся зьезды 2-ой, 3-яй, 10-яй армій, якія ў рэзалюцыях пастанавалі арганізаваць Ваенна-Рэвалюцыйныя Армейскія Камітэты. Орган Менскага Камітэту эс-эраў «Социалист-Революционер» зачынены, буржуазная свабода «друку» была абмяжована.

3(16), Пятніца. Ваенна-Рэвалюцыйны Камітэт выдаў свой загад № 2, у якім **заклікае ўсіх грамадзян Заходняга фронту і вобласьці выконваць толькі распараджэньні новага народнага ўраду.**

4(17), Субота. Цэнтральнае бюро Прафсаюзаў г. Менску зрабіла пастанову дзеля наладжаньня кантакту паміж Камітэтам Ратунку і Менскім саветам, аднак, гэтая «Викжельская» палітыка ЦБ спазьнілася. **Камітэт Ратунку памёр.**

Цэнтральнае бюро Прафэсыянальных Саюзаў г. Менску адмовілася паслаць сваіх прадстаўнікоў у Ваенна-Рэвалюцыйны Камітэт, а парашыла склікаць сваю камісію дзеля ўстанаўленьня кантакту паміж Ваенна-Рэвалюцыйным Камітэтам і Камітэтам Ратунку.

5(18), Нядзеля. Генэрал Балуеў, галоўнакамандуючы Заходнім фронтам разаслаў усім начальнікам тэлеграму наступнага зьместу: **«В Минскэ Комитет Спасения распался. Комиссар Жданов сложил полномочия. Верх взял Совет Рабочих и Солдатских Депутатов, образовав Военно-Революционный Комитет, который взялся держать все в порядке».**

7(20), Аўторак. Апублікавана прапанова Савету Народных Камісараў Галоўнакамандуючаму генэралу Духоніну спыніць ваенныя дзеі з мэтаю пачаць мірныя перамовы.

9(22), Чацьвер. Савет Народных Камісараў паслаў генэралу Духоніну новую радыёграму, у якой зазначалася, што **справа заключэньня міру перададзена самым салдацкім масам.**

(Канец будзе).

*) Працяг. Гл. «С. Б.» № 150.

*) Віцебскія бальшавікі, злучыўшыся з інтэрнацыяналістамі, абраўшы ў камітэт пераважную большасьць бальшавікоў, пайшлі на кампраміс: утвораная арганізацыя прыняла назву «Віцебская арганізацыя РСДРП (інтэрнацыяналістаў)». На подступах да Кастрычніка назва была зьменена ў «Віцебскую арганізацыю РСДРП (бальшавікоў)». І. Бар.

ХРОНІКА.

ПРЫВІТАНЬНЕ К. ЦЭТКІН.

ЦК Мопру БССР паслаў прывітальную тэлеграму К. Цэткін у сувязі з яе 70-цігадовым юбілеем.

Беларускі Мопр жадае слаўнай змагаўніцы за справу працоўных ва ўсім сьвеце далейшага посьпеху.

Новыя катэдры ў Інбелкульце.

Інбелкульт праэктуе арганізацыю цэлага шэрагу новых навукова-дасьледчых катэдр як па аддзелу гуманітарных навук, так і па аддзелу навук прырода-гаспадарчых. Апроч гэтай працы зараз адбываецца абмеркаваньне супольна з сацыяльна-культурнай сэкцыяй Дзяржплану БССР кантрольных лічбаў для Інбелкульту на 1927-28 акадэмічны год, якія вызначацца прыблізна ў 450.000 руб.

Дзіцячы пакой у доме адпачынку.

З 1 ліпеня ў доме адпачынку ў Ждановічах Менска страхкаса адчыніла спэцыяльны пакой для дзяцей матак-работніц. Па меры патрэбы пакой будзе пашырацца.

Страхоўка за зьнішчаныя пасевы.

За 1-ю палову чэрвеня ў БССР градам і бураю зьнішчана 75.300 дзесяцін засеваў. З пачатку чэрвеня да 6 ліпеня Управа Дзяржстраху (апроч акруговых аддзяленьняў) выплаціла страхавыя прэміі ў суме 103.000 р.

«Скарынінскі зборнік».

Гэтымі днямі вышла з друку найбольш буйное выданьне Інбелкульту: зборнік прац, прысьвечаных 400 годзьдзю беларускага друку ці так званы „Скарынінскізборнік". У зборніку 350 старонак, багата ілюстраваных адбіткамі з беларускіх выданьняў XVI стагодзьдзя.

«Кастрычнік на Беларусі.»

Музэй Рэвалюцыі пры ЦК КПБ выдае другі зборнік «Кастрычнік на Беларусі». Матарьялы зборніку будуць прысьвечаны часу польскай акупацыі.

Самалёт—«Пралетары Сувязі».

ЦП саюзу працаўнікоў народнай сувязі пастанавіла распачаць збор сродкаў на пабудову самалёта «Пралетары сувязі».

Па мясцох разасланы спэцыяльныя дырэктывы, у якіх прапануецца выкарыстаць „тыдзень абароны" для больш хуткага пабудаваньня самалёту.

Лік працоўных калектываў расьце.

За апошні год для больш пасьпяховай барацьбы з беспрацоўем, усебеларускі саюз камунальных рабочых адчыніў 15 новых працоўных калектываў.

У выніку—зараз па БССР саюз мае 44 сваіх калектываў, а ў іх—звыш 3.000 беспрацоўных.

Здарэньні.

„Шакалы".

У Пукаўскай працкалёніі невядомыя злачынцы паламалі фамільны склеп б. абшарнікаў Іодко і выцягнулі з яго труну былой абшарніцы К. Іодко, думаючы, што знойдуць там каштоўнасьці. Асобы злачынцаў дазнаньнем высьвятляюцца.

Страты ад новае навальніцы.

28 чэрвеня ў Лёзьненскім раёне, Віцебскай акр., у 4 сельсаветах градам і навальніцай зьнішчана звыш 400 дзесяцін пасеваў. У Чаўскім раёне, Магілеўскае акр.—каля 300 дзес. Пасевы зьнішчаны на 60 проц.

Падрыхтоўка да правядзеньня каналізацыі ў Менску.

30-га чэрвеня ў Менск з Масквы ад акцыянэрнага таварыства «Водоканал» прыехаў інжэнэр А. Лукіных.

Інж. А. Лукіных прыехаў дзеля атрыманьня ад Менскага акрвыканкому канчатковага рашэньня па пытаньні аб спосабе ачысткі гораду ад сточных водаў і па пытаньні аб месцы, дзе і як будуць ачышчацца гэтыя воды.

Апроч гэтага, прыезд інжэнэра А. Лукіных беспасрэдна зьвязаны з зацьвярджэньнем эскізнага праэкту каналізацыі г. Менску і з пераглядам асноўных заданьняў у зьвязку са складаньнем дэтальнага праэкту каналізацыі.

У гэтых заданьнях будуць высьвятляцца раёны работ па каналізацыі першай чаргі і вызначацца работы на першыя 3 гады.

Справаю каналізацыі гэтымі днямі займалася спэцыяльная камісія ў складзе А. Лукіных і прадстаўнікоў ад АВК, Камгасу санітарнага нагляду, рэспубліканскага інжэнэра і інш.

Камісія дэтальна азнаёмілася са спосабамі пабудовы каналізацыі, якія магчымы ў Менску.

Канчаткова яна спынілася на тым, каб утварыць палі абваднення на беразе рэчкі Сьляпянкі. Пасьля ачысткі на палёх арашэньня сточная вада будзе спускацца ў р. Сьляпянку. Рэчка Сьляпянка мае быць урэгулявана.

Камісія вызначыла гэткі плян работ па каналізацыі 1-й чаргі: 1] пабудова [заканчаньне] нямігскага калектара; 2] калектара на Ляхаўцы; 3] на Кажавеннай вул. 4] на Савецкай вул. [ад Лагойскагай вул. да р, Сьвіслачы] і 5) пабудова сеткі па тых галоўных вуліцах, вада з якіх будзе пападаць у пераліченыя калектары.

А. Лукіных учора зрабіў аб гэтым даклад у прэзыдыуме АВК. С.

СА УСЯГО СЬВЕТУ.

— З найбольшага аэрадрому ў Парыжы Le Bourget вылецела ў працягу 1919 г. толькі 699 пасажыраў. У 1926 годзе лічба іх дайшла да 27850.

— У Злучаных Штатах П. А. ёсьць 16.000 кіно. Кожны тыдзень праз іх праходзіць 60 міл. чалавек.

— Вядомы па сваіх сьмелых палётах у пачатку разьвіцьця авіяцыі Фарман, які цяпер зьяўляецца ўласьнікам вялікіх фабрык аэрапланаў, абвясьціў новы палёт над акіянам. Гэты палёт правядзе французкі пілёт на апараце „Фармана" з Парыжу да Нью-Ёрку.

Фарман сказаў прадстаўнікам друку што з палётаў, якія былі выкананы праз Атлянтык найбольшае практычнае значэньне мае палёт Бырда, таму што ён даказаў магчымасьць паветранай камунікацыі.

— З вядомай апэратачнай польскай артысткай К. Невяроўскай здарыўся няшчасны выпадак: яна мыла ў бэнзіне сваю адзежу. Бензын запаліўся і полымя абхапіла Невяроўскую, якая ад вялікіх апалаў у страшэнных муках памёрла.

Апавяшчэньні.

— Сад працасьветы, сёньня гуляньне, аркестр муз., балет, канцэрт, і кіно для сяброў саюзу. Пачатак а 7 гадз. увечары.

На карысьць беспрац. сяброў саюзу.

— Сёньня, 7-VII, а 6 гадз. увеч. у малай залі клюбу імя К. Маркса адбудзецца нарада апоргаў парт'ячэек па пытаньні аб правядзеньні тыдню абароны.

Яўка ўсіх апоргаў абавязкова, за выключэньнем тых, з якімі праведзена нарада ў паняддзелак, 4-VII.

— У пятніцу, 8-7, а 7 гадз. увечары ў малай залі клюбу імя К. Маркса адбудзецца агульна-гарадзкая нарада камісій пры прадпрыёмствах і прафсаюзах па падрыхтоўцы да 10 гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі.

Яўка ўсіх членаў камісій абавязкова.

Да ведама беспрацоўных немцаў.

Беспрацоўныя немцы, якія знаходзяцца на вучоце Менскай біржы працы і жадаюць перасяліцца ў Паволожжа, павінны зьявіцца на біржу для запісі. Запісь будзе весьціся з 8 да 12 ліпеня. Павінны зьявіцца таксама асобы, якія запісаліся раней.

Ад ЦКК КП(б)Б.

У сераду, 13-га ліпеня г. г., а 7-й гадзіне ўвечары адбудзецца пасяджэньне Парткалегіі ЦКК КП(б)Б (Савецкая 55, 3-ці паверх, пакой № 18), дзе будуць разглядацца справы наступных таварышоў: 1. МАКАРКОВА Пятра Рыгоравіча—Калін. акр., 2. КІЯВІЦКАГА Максіма Хвёдаравіча—Слуцк. акр., 3. АРХІПЕНКА Трафіма Хвёдаравіча—Бабруйск. акр., 4. ШЫЦІКА Спірыдона Антонавіча—Аршанск. акр., 5. ГЛОЎСКАГА Станіслава Мар'янавіча—Менск. акр., 6. ГЕРАСЕВА Хвёдара Іванавіча—Менск. акр.

Памянёныя таварышы павінны зьявіцца ў Парткалегію да вызначанага часу. Праезд за свой кошт.

Пастановы і загады ўраду Б.С.С.Р.

Пастанова

Савету Народных Камісараў Беларускае ССР

аб зацьверджаньні палажэньня аб навуковых працаўнікох вышэйшых школ і навуковых устаноў.

Савет Народных Камісараў пастанаўляе зацьвердзіць палажэньне аб навуковых працаўнікох вышэйшых школ і навуковых устаноў БССР.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў БССР М. Мароз.

8 чэрвеня 1927 г. г. Менск.

ПАЛАЖЭНЬНЕ

аб навуковых працаўнікох вышэйшых школ і навуковых устаноў БССР.

Назначэньне і звальненьне навуковых працаўнікоў.

1. Навуковымі працаўнікамі вышэйшых школ і навуковых устаноў БССР зьяўляюцца асобы, якія вядуць навуковую ці навучальную працу ў гэтых школах і установах.

2. Да навуковых працаўнікоў вышэйшых школ належаць прафэсары, дацэнты, асыстэнты і асьпіранты. Да навуковых працаўнікоў навуковых устаноў належаць члены і навуковыя супрацоўнікі гэтых устаноў, катэгорыі, а таксама спосабы назначэньня і звальненьня якіх устанаўляюцца статутамі гэтых устаноў.

Увага: У вышэйшых школах да дацэнтаў прыроўніваюцца праэктары, да асыстэнтаў—памоцнікі праэктара, да асьпірантаў—ардынатары клінік.

3. Прафэсары чытаюць лекцыі па сваёй спэцыяльнасьці, вядуць практычныя заняткі і кіруюць навуковымі працаўнікамі данае дысцыпліны.

Увага: Загадваньне катэдраю даручаецца прафэсару спэцыяльнаю пастановаю дэканату адпаведнага факультэту.

4. Дацэнты пры адпаведнай катэдры чытаюць лекцыі і вядуць практычныя заняткі.

Увага: Дацэнты дапушчаюцца да часовага загадваньня катэдраю, калі няма прафэсара данае дысцыпліны.

5. Асыстэнты пад сталым кіраваньнем прафэсара падрыхтоўваюцца да навукова-дасьледчае і пэдагагічнае працы ў вышэйшых школах, вядуць практычныя заняткі і могуць быць дапушчаны да чытаньня лекцый на паасобных аддзелах дысцыплін.

6. Прафэсарам можа быць асоба, якая зьяўляецца аўтарам самастойных навуковых прац, ухваленых двума спэцыялістамі адпаведнае дысцыпліны, і займалася навуковаю працаю ня менш як 6 год, у тым ліку—ня менш як 3 гады ў якасьці дацэнта.

7. Дацэнтам можа быць асоба, якая зьяўляецца аўтарам аднае альбо большага ліку навуковых прац, ухваленых двума спэцыялістамі адпаведнае дысцыпліны, і мае ня менш трохгадовага навукова-пэдагагічнага стажу.

8. Асыстэнтам можа быць асоба, якая займалася навуковаю працаю ня менш як 2 гады і прапанована адпаведнаю прадметнаю камісіяю па заключэньні прафэсара.

Увага: Народны Камісарыят Асьветы можа назначыць на пасаду прафэсара, дацэнта і асыстэнта (арт. арт. 6, 7 і 8) асобу, якая ня мае прадугледжанага памянёнымі артыкуламі стажу.

9. Калі няма кандыдатаў, задавальваючых патрабаваньням артыкулаў 7 і 8, то кіраўніцтва вышэйшае школы па паданьні дэканату можа хадайнічаць перад Народным Камісарыятам Асьветы аб назначэньні дацэнтам альбо асыстэнтам асобы, якая не задавальвае гэтым патрабаваньням, але вядома сваёю працаю ў данай галіне.

10. Асьпірантамі могуць быць асобы, скончыўшыя з посьпехам даную альбо іншую вышэйшую школу.

Увага: Дэканат можа патрабаваць, каб асоба, якая прапануецца ў асьпіранты, вытрымала калёквіум у спэцыяльнай камісіі, складзенай з дэкана і двох спэцыялістых.

11. Асоба, якая жадае быць прафэсарам, дацэнтам альбо асыстэнтам даннае вышэйшае школы, падае ў кіраўніцтва школы адпаведную заяву з далучэньнем: а] свайго жыцьцяпісу, б] сьпісу навуковых прац, а калі магчыма, то і самых прац, в) іншых дакумантаў аб яе навуковай дзейнасьці, калі яны ёсьць.

Увага: Кіраўніцтва вышэйшае школы абвяшчае конкурс на вакантныя прафэсуры і дацэнтуры праз публікацыю ў газэтах «Савецкая Беларусь» і «Известия ЦИК СССР и БЦИК».

12. Паказаныя ў папярэднім артыкуле заявы разглядаюцца дэканатам разам з заключэньнямі двох спэцыялістых. Ухваленыя дэканатам кандыдатуры абмяркоўваюцца на пасяджэньні кіраўніцтва вышэйшае школы, у удзелам дэкану адпаведнага факультэту, які карыстаецца ў гэтым выпадку правам пастаноўчага голасу. Пастанова кіраўніцтва аб абраньні прафэсара, дацэнта альбо асыстэнта разам з усімі дакумантамі падаецца на зацьверджаньне Народнага Камісарыяту Асьветы.

13. Народны Камісарыят Асьветы можа назначыць свайго кандыдата з асоб, адпавядаючых патрабаваньням арт. арт. 6-8.

14. Прафэсары назначаюцца ў даную вышэйшую школу на 7 год, дацэнты—на 6 год, асыстэнты—на 3 гады.

15. Навуковыя працаўнікі вышэйшых школ могуць быць звольнены ў выпадках:

а) зачыненьня вышэйшае школы альбо скарачэньня пасады;

б) неадпаведнасьці займаемай пасадзе.

Увага: Неадпаведнасьць навуковага працаўніка займаемай пасадзе павінна быць засьведчана спэцыяльнаю парытэтнаю камісіяю з прадстаўнікоў адміністрацыі (Народнага Камісарыяту Асьветы і вышэйшае школы) і прафэсыянальнага саюзу [Сэкцыі Навуковых Працаўнікоў Саюзу Працаўнікоў Асьветы].

в] учыненьня злачынства, беспасрэдна зьвязанага з працаю і ўстаноўленага увайшоўшаю ў сілу пастановаю суду;

г] нявыхаду на працу з прычыны часовае страты працаздольнасьці на тэрмін больш як адзін сэместр.

Увага. Непрацаздольныя навуковыя працаўнікі на працягу году ад дня страты працаздольнасьці захоўваюць права вярнуцца на пасаду, якую яны займалі і тады, калі ў час іх непрацаздольнасьці іх пасада часова была занята іншаю асобаю.

д] асабістага жаданьня ў пэрыяд з 1-га чэрвеня да 1-га жніўня кожнага году;

е] дасягненьня навуковым працаўніком 65 год;

ж] скончэньня тэрміну назначэньня.

Увага. Пры звальненьні ў выпадках паказаных у пунктах: «а», «г», «д», «е» і „ж" гэтага артыкулу, прафэсар захоўвае годнасьць прафэсара.

16. Прафэсары і дацэнты перамяшчаюцца на працу па іншай дысцыпліне ў парадку, прадугледжаным арт. 12-м гэтага Палажэньня.

17. Асьпіранты пакідаюцца пры вышэйшай школе на тры гады для падрыхтоўкі да навукова-пэдагагічнае дзейнасьці па праграмах, апрацованых прадметнаю камісіяю і зацьверджаных дэканатам.

18. Асьпіранты павінны два разы на год падаваць прадметнай камісіі пісьмовую справаздачу аб сваёй працы. Калі справаздача ня будзе пададзена бяз важных прычын, альбо калі прадметная камісія прызнае справаздачу нездавальняючаю, то асьпірант выключаецца з ліку навуковых працаўнікоў вышэйшае школы.

19. Пасьля выкананьня асьпірантам усіх заданьняў і абароны з посьпехам навуковае працы на публічным пасяджэньні прадметнай камісіі альбо пры дасьледчай катэдры кіраўніцтва вышэйшае школы выдае яму адпаведнае пасьведчаньне на права выкладаньня данае спэцыяльнасьці ў вышэйшых школах.

20. Навуковыя працаўнікі вышэйшых школ і навуковых устаноў БССР могуць праз кожныя тры гады службы атрымоўваць навуковыя камандыроўкі з захаваньнем утрыманьня на тэрмін ня менш як на тры месяцы і ня больш як на шэсьць месяцаў з захаваньнем утрыманьня і незалежна ад раней даваных службовых камандыровак.

Увага. Правілы камандыраваньня ў парадку арт 20 устанаўляюцца інструкцыяй Народнага Камісарыяту Асьветы.

21. Навуковыя працаўнікі вышэйшых школ і навуковых устаноў карыстаюцца правам на бесперапынны двухмесячны адпачынак у час летніх канікул.

II.

Аб наданьні навуковае годнасьці доктара

22. Вышэйшыя школы і навукова-дасьледчыя ўстановы БССР маюць права падаваць навуковым працаўнікам годнасьць доктара па навуковых дысцыплінах, пералік якіх зацьвярджаецца Народным Камісарыятам Асьветы.

23. Асобы, жадаючыя атрымаць годнасьць доктара, падаюць аб гэтым заяву ў кіраўніцтва адпаведнае вышэйшае школы альбо навуковае ўстановы. Да заявы павінен быць далучаны жыцьцяпіс жадаючага атрымаць годнасьць доктара і ня менш як у трох экзэмплярах яго працы па данай спэцыяльнасьці, маючыя характар самастойнага навуковага дасьледваньня. Гэтыя матар'ялы перадаецца кіраўніцтвам у дэканат адпаведнага факультэту ў вышэйшых школах, альбо ў адпаведную навуковую калегію ў навукова-дасьледчых установах.

24. Дэканат альбо навуковая калегія назначае ня менш двох рэцэнзентаў, якія на працягу шасьці месяцаў даюць свае матываваныя заключэньні аб паданых працах. Атрымаўшы заключэньні, дэканат альбо навуковая калегія вырашае пытаньне аб тым, ці можа падаўшая заяву асоба быць дапушчана да публічнае абароны сваіх прац. Пастанова дэканату зацьвярджаецца кіраўніцтвам вышэйшае школы, а пастанова навуковае калегіі—кіраўніцтвам адпаведнае ўстановы.

Увага. Заключэньні рэцэнзэнтаў друкуюцца ў навуковым органе вышэйшае школы альбо навуковае ўстановы.

25. Асобы, якія дапушчаны да публічнае абароны сваіх прац, абараняюць іх на адчыненым пасяджэньні з удзелам прафэсароў і дацэнтаў адпаведнага аддзяленьня факультэту, іншых прафэсароў і выкладчыкаў данае спэцыяльнасьці гэтае вышэйшае школы і рэцэнзэнтаў пад старшынствам дэкану. У навуковых установах абарона прац адбываецца ў пленарным пасяджэньні навуковае калегіі гэтых устаноў. Апанэнтамі выступаюць рэцэнзэнты і кожны жадаючы з прысутных на пасяджэньні навуковых працаўнікоў.

26. Пасьля дыспуту ўдзельнікі пасяджэньня абмяркоўваюць кандыдатуру і адкрытым галасаваньнем вырашаюць пытаньне аб наданьні годнасьці доктара. Годнасьць доктара надаецца, калі за гэта галасуе ня менш 2/3 усіх прысутных прафэсароў і дацэнтаў адпаведнага аддзяленьня факультэту, іншых прафэсароў і выкладчыкаў данае спэцыяльнасьці ў гэтай вышэйшай школе і рэцэнзэнтаў (арт. 24), а ў навуковых установах—членаў навуковае калегіі з правам пастаноўчага голасу і рэцэнзэнтаў.

27. Рашэньне пасяджэньня падаецца ў кіраўніцтва вышэйшае школы, альбо навуковае ўстановы, якое разам са сваім заключэньнем і з усімі матар'яламі накіроўвае яго ў Народны Камісарыят Асьветы. Народны Камісарыят Асьветы мае права на працягу аднаго месяцу не згадзіцца з гэтым рашэньнем.

28. У выключных выпадках вучоным, якія маюць вялікія навуковыя заслугі і добра вядомы сваімі навуковымі працамі, годнасьць доктара можа надавацца парадкам, прадугледжаным у гэтым разьдзеле, але без абароны імі сваіх прац.

29. Асобам, кандыдатуры якіх зацьверджаны Народным Камісарыятам Асьветы, выдаецца дыплём на годнасьць доктара пэўнай галіны навукі данае вышэйшае школы альбо навуковай установы. Дыплём падпісваецца Народным Камісарыятам Асьветы і рэктарам вышэйшае школы альбо старшынёю (дырэктарам і г. д.) навуковае ўстановы.

III.

Аб матар'яльным забесьпячэньні навуковых працаўнікоў.

30. Асобы, праслужыўшыя ў вышэйшых школах і навуковых установах у якасьці навуковых працаўнікоў ня менш 25 год альбо дажыўшы да 65 год, калі яны праслужылі на такіх пасадах ня менш 10 год, маюць права на пэнсію ў разьмеры асноўнага акладу адпаведнае катэгорыі навуковых працаўнікоў з аўтаматычнаю зьменаю пэнсіі па меры зьмены асноўнага акладу.

Увага. Вышэйшыя школы і навуковыя ўстановы са згоды Народнага Камісарыяту Асьветы могуць залічаць у паказаны ў гэтым артыкуле стаж навуковую альбо пэдагагічную працу данае асобы да залічэньня яе ў навуковыя працаўнікі.

31. Навуковыя працаўнікі, якія па стану здароўя прымушаны пакінуць службу раней 65 гадоў, калі яны займаліся навуковаю альбо пэдагагічнаю працаю ня менш 20 год і з іх 1/3 на навукова-навучальных пасадах, маюць права на пэнсію ў разьмеры поўнага акладу; калі-ж яны займаліся навуковаю альбо пэдагагічнаю працаю ня менш 15 год і з іх 1/3 на навукова-навучальных пасадах, то ў разьмеры 1/2 акладу.

32. Навуковыя працаўнікі, страціўшыя працаздольнасьць у зьвязку з выкананьнем імі службовых абавязкаў, атрымоўваюць пэнсію ў разьмеры поўнага акладу незалежна ад тэрміну службы.

33. Пасьля сьмерці навуковага працаўніка, атрымаўшага альбо меўшага права на пэнсію, супруг, які знаходзіўся на ўтрыманьні памёршага, мае права на палову пэнсіі, а ўсе іншыя члены сям'і, якая знаходзілася на ўтрыманьні памёршага,—на чвэрць пэнсіі кожны, але з такім разьлікам, каб агульны разьмер пэнсіі не перавышаў пэнсіі памёршага.

Увага: Пэнсія непрацаздольным з прычыны непаўналецьця выдаецца да іх грамадзянскага паўналецьця.

34. Калі навуковы працаўнік, які мае права на пэнсію, служыць, то ён, пакуль не пакіне службу, атрымоўвае толькі палову належачае яму пэнсіі.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў БССР М. Мароз.

8 чэрвеня 1927 г. г. Менск.

БАЛЯНС

па Цэнтраземскладу на 1-е кастрычніка 1926 году.

АКТЫЎ

НАЗВА РАХУНКАЎ.	Сума часн.	Сума агульн.	%% суадносіны.
1. Грашовыя сродкі і каштоўн. паперы.			
а) Каса	13484-02		
б) Бягучыя рахункі	161370-51		
в) Паі і акцыі	29100 —		
г) Каштоўныя паперы	24141-98	228096-51	7,62
2. Матар'яльныя каштоўнасьці.			
а) Тавары ў магазынах і склад.	1176775-79		
б) Гатовыя выробы ў майстэрн.	19955-25		
в) Запасныя часьці да машын	21263-07		
г) Матар'ялы для вытворчасьці	73818-37		
д) Матар'ялы ў транспарце	313-95	1292126-43	43,19
3. Маемасьць.			
а) Будынкі і пабудовы	40906-95		
б) Машыны і тэхнічн. абсталяван.	50981-47		
в) Інструманты	4851-83		
г) Жывы інвэнтар	900 —		
д) Розны інвэнтар	40928-64		
е) Скончаны капітальн. рамонт	6876-60	145445-49	4,86
4. Дэбітары.			
а) Пакупшчыкі і інш. дэбітары	49621-80		
б) Дастаўшчыкі	517367-92		
в) Розныя асобы і ўстановы	8956-87		
г) Рабочыя і служачыя	1480-28		
д) Няпэўныя даўгі	27171-27	604598-14	20,21
5. Падсправаздачныя сумы	513-44	513-44	0,02
6. Абавязацельствы да атрыманьня.			
а) Вэксалі ў партфэлі	248054-95		
б) Вэксалі прасрочан. і апратэставаныя	15880-86		
в) Вэксалі ў вучоце	417956-23	681892-04	22,79
7. Расходы будуч. году	21800-87	21800-87	0,73
8. Няскончаныя апэрацыі.			
а) Няскончаная вытворчасьць	17337-79	17337-79	0,58
БАЛЯНС	—	2991810-71	100
Па-за балянсам.			
1. Дэбітары па гарантыйн. вэксалёх (Белсельбанк)	419314-50	419314-50	
2. Атрыманыя гарантыі	2000 —	2000 —	

ПАСЫЎ

НАЗВА РАХУНКАЎ.	Сума часн.	Сума агульн.	%% суадносіны.
1. Капіталы.			
а) Устаўны	460329-36		
б) Запасны	31772-51	492101-87	16,45
2. Фонды.			
а) Амортызацыйны	17187-21		
б) Няпэўныя даўгі	27171-27		
в) Палепшаньне быту рабочых	1975-38		
г) Стандартызацыйны	5301-75		
д) Забесьпяч. перацэн. тавараў	16700-56	68336-17	2,28
3. Пазыкі і крэдыты.			
а) Спэцыяльн. бяг. рахун. пад тавары	78600 —		
б) Банкі на вучоту вэксал.	417956-23		
в) Доўгатэрмінов. ссуда НКФ	300000 —	796556-23	26,62
4. Вэксалі выдадзеныя.	1315487-11	1315487-11	43,97
5. Крэдытары.			
а) Крэдытары (пакупшчыкі і інш. расч.)	50458-70		
б) Дастаўшчыкі	11940-12		
в) Розныя асобы і ўстановы	3953-58		
г) Рабочыя і служачыя	7937-69		
д) Наркамзем	42010-06		
е) НКФ па адлічэн. у прыбытак казны	8106 —		
ж) Пераходзячыя сумы	6825-25	131231-40	4,39
6. Падсправаздачн. сумы	29-74	29-74	—
ВЫНІКІ.			
а) Прыбытак справаздачнага году	188068-19	188068-19	6,29
БАЛЯНС	—	2991810-71	100
1. Выдадзеныя гарантыі	419314-50	419314-50	
2. Крэдытары па гарант. вэксал.	2000 —	2000 —	

Дырэктар-распарадзіцель ТАЛАПІЛА. Загадч. вучотна-фінанс. аддзелу КЛІШЭЎСКІ. Глаўбух ЮРКШТОВІЧ.

РАХУНАК

прыбыткаў і ўбыткаў за 1926 апэрацыйны год.

АКТЫЎ

Заработная плата, сацстрах і прафсаюзы		164.268-15
Наём памяшканьня і рамонт		41.869-52
Канцэлярскія выдаткі		6.516-09
Страхоўка тавараў і кас		3.788-07
Падаткі і зборы		71.039-45
Іншыя выдаткі		73.123-37
Проценты на вэксалёх і пазыках у суме 161.573 р. 32 к., а за выключэньнем атрыманых 38 947 р. 98 к.		122.625-34
Страты пры продажы і пераацэнцы тавараў		76.120-26
Прыш. у нягоднасьць тара, усушка і ўтруска		41.688-59
Сьпісана па перарахунк. мінулых гадоў і безнадз. даўг.		9.028-99
Бясплатныя выдачы		2.057-75
Розных сьпісаньняў		204-20
На амартызацыю і ў забясьпеч. няпэўных даўгоў		20.478-28
Страты па майстэрн. ад розных прычын	16.000 р. 95 к.	
На амартызацыю	8.299 р. 34 к.	24.300-29
На амартызацыю транспарту		448-12
Усяго		657.556-47
Чысты прыбытак за 1925-26 г.		188.068-19
АГУЛАМ		845 624-66

ПАСЫЎ

Валавы прыбытак ад рэалізацыі тавараў	793.791-14
Прададзеная тара і атрыманы лом ад забракаваных тавараў	10.700-18
Па перарахунках мінулых гадоў і безнадз. даўгоў	3.351-23
Іншых прыбыткаў	4.887-20
Прыбыткі па майстэрн.	30.432-47
Прыбыткі ад эксплёатацыі транспарту	2.462-44
Усяго	845.624-66
АГУЛАМ	845.624-66

Разьмеркаваньне прыбыткаў за 1925-26 год.

Падаходны падатак	18.806-82
Фонд палепшаньня быту рабочых і служачых	18.806-82
Запасны капітал	37.613-64
Даход казны	40.000 —
Устаўны капітал	72.840-91
АГУЛАМ	188.068-19

Дырэктар-распарадзіцель ТАЛАПІЛА. Загад. вучотна-фінанс. аддзелу КЛІШЭЎСКІ. Глаўбух ЮРКШТОВІЧ.

Заключны баланс на 1-га кастрычніка 1926 г., рахунак прыбыткаў і ўбыткаў і разьмеркаваньне прыбыткаў за 1925-26 г. зацьверджаны на пасяджэньні пастаяннай камісіі пры ўправе дзяржаўных прыбыткаў НКФ ад 23-V 1927 г. і да публікацыі дазваляецца.

Вык. аб. Нач. Управы дзярж. прыбытк. НКФ БССР ВОЛПАЎ. Інспэктар СТАЯНОЎСКІ

СУД.

Федарэнка «арганізоўвае» каапэратыў.

Афэрысты водзяцца ня толькі ў горадзе. Ня мала іх ёсьць і на вёсках.

Завёўся гэткі афэрыст і ў в. Зеляночы, Калінкавіцкага р. Зеляночы невялікая, бедная вёска. Жыве пастарому.

Урэшце, сяляне задумалі новае жыцьцё будаваць. Сабралі адзін сход. Сабралі другі.

Гаварылі, спрачаліся і пастанавілі: перш-наперш адчыніць у вёсцы каапэратыў.

Будзе каапэратыў—тавары будуць. Лягчэй жыцьцё пойдзе. Добрая рэч каапэратыў. Але як-жа яго адчыніць?

Вось тут на сцэну і выплывае Давід Федарэнка.

— Няўжо вы ня ведаеце, як каапэратывы адчыняць?

— Ня ведаем,—адказалі сяляне.

— Шкада. А я, вось, у горадзе калі жыў, сам штук 20 каапэратываў адчыніў.

— Братка, дапамажы!

Сяляне зьвярнуліся да Федарэнка з просьбай арганізаваць ім каапэратыў.

Ну, а Федарэнка гэтага толькі і чакаў.

— Добра, каапэратыў я вам арганізую, і гэта будзе не каапэратыў, а цэлы гандлёвы гарадок, толькі для гэтага мне патрэбны грошы. Ганіце грошы!

Пачасалі сяляне патыліцы, патапталіся на месцы...

— Што-ж зробіш, бяз грошай каапэратыву мець ня будзеш.

Агульнымі сіламі сабралі 300 руб. і аддалі іх Федарэнку.

Дураку, як кажуць, шчасьце.

Узяў Федарэнка грошы і пайшоў тавары для каапэратыву закупляць. Адышоў вёрст пяць ад вёскі, схаваў грошы ў лесе. Трошкі твар сабе раскрывяніў і пайшоў у бліжэйшую міліцыю заяўляць:

— Бандыты напалі, зьбілі і... грошы грамадзкія забралі.

Толькі гэты нумар Федарэнку не прайшоў: арыштавалі Федарэнка. Прызнаўся.

Мазырскі Нар. Суд 6-га вучастку прыгаварыў Д. Федарэнка на паўтара годы зьняволеньня.

Я. С.

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

„Касір".

У Заслаўскім райвыканкоме прыбіральшчыкам служыў Пётра Шчасны. Ён падрабіў да касы адмычку і пачаў цягаць адтуль грошы дробнымі сумамі. Урэшце, Шчасны быў злоўлен на месцы праступленьня. Менскі Акр. Суд прыгаварыў Пётра Шчаснага на тры гады зьняволеньня ўмоўна.

КІНО.

КІНО «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА».

З аўторка, 5-га ліпеня, па чацьвер, 7-га ліпеня [уключна].

„ОТРЕЗАННЫЕ ОТ МИРА".

2-я сэрыя ў 10-х частках.

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ».

З аўторка, 5-га ліпеня.

Вялікая замежная пастаноўка

ЯНКА КОНСУЛ. Камэдыя у 7-х частках.

Звыш праграмы—выступленьне выкан. цыганск. раманса ў М. Нароўскай.

КНИГИ ПО РЫБОЛОВСТВУ.

Арнольд. Общедоступное руководство по рыбоводству. 75 коп. Берг. Рыбы пресных вод, 2 руб., Проф. Н. Книпович.—Каспийское море и его промыслы—60 коп., Проф. А. Никольский—Гады и рыбы—2 руб. 50 коп., Формозов—Рыболовство —40 коп.

Заказы выполняются наложенным платежом. Требования и деньги (можно марками) направлять по адресу:

МОСКВА, 155, Малая Бронная, 10, помещение 3, „КНИЖНАЯ ПОЛКА". 2-6.

ВСЕМ НЕОБХОДИМО ПРИОБРЕСТИ АВТОМАТИЧЕСКИЙ СЧЕТЧИК,

который без всяких знаний МОМЕНТАЛЬНО дает готовые результаты умножения, деления и вычисления процентов. Высылается немедленно по получении заказа и 50 к. За пересылку и упаковку 20 к., всего 70 к. (можно марками). Наложенным платежом высылается от 3 руб.

Заказы и деньги направлять по адресу: Москва 155, Малая Бронная, 10, помещение 3, „КНИЖНАЯ ПОЛКА". 4—30

ВЫ ХОТИТЕ ИМЕТЬ ВЕРНЫЙ ЗАРАБОТОК?

Требуйте новую книгу проф. Ленингр. Полит. Института В. В. ВАЛЬГИСА. Сборник техно-химических рецептов и производственных советов, составленную по новейшим проверенным немецким, американским, английским и французским данным, 40 печатных листов, 600 стр., свыше 2000 всевозможных рецептов и практических советов по всем видам производства. С приложением алфавитного указателя основных процессов, приборов и сырья, а также новые законы о кустарных и промысловых предприятиях.

Цена сборника в переплете 6 руб. 40 коп.

Заказы высылаются наложенным платежом.

Требования и деньги (можно марками) направлять по адресу: Москва, 155, Малая Бронная, 10, помещение 3, „КНИЖНАЯ ПОЛКА".

Подробный проспект высылается за 2-3-ми коп. марки.

АБВЕСТКА.

У СУВЯЗІ З ЛІКВІДАВАНЬНЕМ КАЛІНІНСКАЙ АКРУГІ 6-ы ЧАРГОВЫ СХОД УПАЎНАВАЖАНЫХ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЙ КААПЭРАЦЫІ 6. КАЛІНІНСКАЙ АКРУГІ, ЯКІ АДБЫЎСЯ 25 ЧЭРВЕНЯ г. г. у г. КЛІМАВІЧАХ, ПАСТАНАВІЎ:

КАЛІНІНСКІ АКРУГОВЫ САЮЗ СЕЛ.-ГАСП., САМАТУЖНА-ПРАМЫСЛОВЫХ І КРЭДЫТНЫХ КААПЭРАТЫВАЎ

„АКРСЕЛЬГАСКРЭДЫТСАЮЗ"

ЗЬЛІЦЬ З МАГІЛЕЎСКІМ АКРСЕЛЬСАЮЗАМ,

перадаўшы пасывы і актывы першага другому па становішчы на 25-га чэрвеня 1927 г. Дзеля ажыцьцяўленьня зьліцьця абрана ліквідацыйная камісія. Асобам, зацікаўленым да б. Калінінскага Акрсельгаскрэдытсаюзу, належыць зварачвацца да ліквідацыйнай камісіі ў Клімавічы да 10 ліпеня г. г., а пасьля непасрэдна ў Магілеўскі Акрсельсаюз.

Намесьнік старшыні ліквідацыйнай камісіі ТРУНОЎ.

Сябар КОЦІН.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Пасьведчаньне Чыжыкава А. А., выд. Батунскім фабзавкомам, кв. 3766.

— Каапэрацыйная кніжка № 13789 Матара М. А., выд. МЦК, кв. 3767.

— Картка на каня № 2685 Шэвелёва М. К. выд. 8 вайсков. вучасткам, кв. № 3768.

— Картка на каня № 7667 Акішчанка К. Е., выд. Хоцімскім РВК, кв. 3769.

— Картка на каня № 1143 Міранкова Я. Д., выд. Хоцімскім РВК, кв. 3770

— Картка на каня № 7636 Прудзікава Б., выд. Хоцімскім РВК, кв. 3771.

— Картка на каня Атрашэнкава З., выд. Хоцімскім РВК, кв. 3772.

Галоўлітбел 24864.

Менск. 1-я дзяржаўная друкарня.